ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІПЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 139 (28249)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Хто «Ракеце» надае «Імпульс»?



## Абітурыентам-2017. Парады бывалых



## Макіяж за пяць хвілін па... інтэрнэце

*ЛІЧБА ДНЯ*

**8266 вакансій**

*налічвалася на 1 ліпеня гэтага года ў базе даных рынку працы горада Мінска. Найбольш востра адчуваецца дэфіцыт медыцынскіх сясцёр-спецыялістаў: згодна з пералікам найбольш запатрабаваных прафесій на 1 ліпеня гэтага года, апублікаваным на сайце камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, у горадзе налічваецца 897 вакансій па гэтай прафесіі. Актуальнымі для рынку працы горада застаюцца такія прафесіі, як урач-спецыяліст (509 вакансій), інжынер (273) і кухар (236).*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.07.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9807 | ▲ |
| Еўра | 2,1770 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0312 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0798 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Рабі дабро

# Партфель збіраем разам!




Фота БЕЛТА.

Дабрачынная акцыя «Партфель першакласніка» праходзіць у Мінску. Яна дапамагае сабраць у школу першакласнікаў з малазабяспечаных, няпоўных і шматдзетных сем'яў. Праводзіцца яна ў буйных сталічных крамах: ЦУМе, ГУМе, гандлёвым доме «На Нямізе», універмагах «Кірмаш» і «Беларусь». Паўдзельнічаць можа кожны: для гэтага дастаткова набыць штосьці са школьных тавараў і канцылярскіх прылад і пакінуць у спецыяльным кантэйнеры. Валанцёры (сярод іх спецыялісты тэрытарыяльных цэнтраў сацабслугоўвання насельніцтва і моладзь з мінскага гарадскога камітэта БРСМ) перададуць вашы падарункі ў «Беларускую асацыяцыю шматдзетных бацькоў». Акцыя працягнецца да 26 жніўня. А 29 жніўня ў кінатэатры «Піянер» ранцы з усім неабходным для вучобы ўручаць 220 першакласнікам.

Сёлета дабрачынная акцыя праводзіцца ўжо 20-ты раз. Летась неабыякавыя гараджане сабралі 300 кілаграмаў сшыткаў, альбомаў і фламастараў і дапамаглі адправіць у першы клас 260 дзяўчатак і хлопчыкаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

■ Побач

# ПЕРАМАГЧЫ БОЛЬ

## Як развіваецца паліятыўная дапамога ў Беларусі?

**На 67-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН цяперашняя сітуацыя з аказаннем паліятыўнай медыцынскай дапамогі была ахарактарызавана як глабальная гуманітарная катастрофа. Такое вызначэнне зусім не перабольшванне, паколькі насамрэч жыццёва неабходныя хворым людзям сродкі і методыкі ў большасці выпадкаў ім недаступныя. Спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) падлічылі: увогуле 40 мільёнаў чалавек маюць патрэбу ў паліятыўнай дапамозе і толькі 14 працэнтаў могуць яе атрымаць. Выходзіць, што больш чым 34 мільёны (!) хворых нават не спадзяюцца палегчыць жудасны боль і паміраюць у пакутах. І гэта ў XXI стагоддзі...**

**Відавочна, становішча экстраардынарнае, таму СААЗ прапануе ўладам усіх краін неадкладна прыняць меры для яго выпраўлення. А якая сітуацыя ў Беларусі? Каб высветліць гэта, мы звярнуліся да галоўнага пазаштатнага спецыяліста Міністэрства аховы здароўя па паліятыўнай медыцынскай дапамозе даросламу насельніцтву, галоўнага ўрача мінскай бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс» Вольгі МЫЧКО.**



***— Увогуле паліятыўная медыцынская дапамога як асобная галіна існуе не так даўно — напрыклад, у Еўропе яна актыўна развіваецца з 1980-х. Чым была выклікана такая неабходнасць?***

— Галоўная прычына — імклівае старэнне насельніцтва. Сучасныя медыцынскія методыкі дазваляюць эфектыўна праводзіць лячэнне шэрагу захворванняў, што дагэтуль лічыліся несуцяшальным дыягназам, актыўна развіваецца, напрыклад, тая ж трасплантalогія. Адразу паўстала праблема медыка-сацыяльнага суправаджэння адпаведных пацыентаў, якіх з кожным годам станавілася ўсё больш. У Сусветнай арганізацыі аховы здароўя існуе такі падыход: калі чалавеку пастаўлены дыягназ хранічнага захворвання, то ён павінен атрымліваць паліятыўную дапамогу. І гэта апраўдана, паколькі ў пацыента з аб'ектыўных прычын (звязаных у першую чаргу з пагаршэннем стану здароўя ў пэўнай перспектыве) кардынальна зніжаецца якасць жыцця. Тут нельга проста адмахнуцца ад чалавека, дакладней — махнуць на яго рукой, маўляў, вынік вядомы...

СТАР. 4

■ Прыёмная кампанія — 2016

# 100 вакантных бюджэтных месцаў яшчэ чакаюць абітурыентаў

**Беларускія ВНУ на мінулым тыдні завяршылі прыём на бюджэтныя аддзяленні, але прыёмная кампанія працягваецца. Гэтымі днямі ў многіх ВНУ праходзяць унутраныя іспыты, а там, дзе дадатковыя экзамены не прадугледжаны, адбываецца адкрытае залічэнне на першы курс.**

Па папярэдніх звестках, самыя высокія прахадныя балы былі зафіксаваныя сёлета ў БДУ на спецыяльнасці «Міжнароднае права» — 385, «Прыкладная інфарматыка (праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм)» — 363. У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце — на спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (пераклад) (кітайская мова)» — 377, на спецыяльнасці «Сучасныя замежныя мовы (пераклад) (англійская мова)» — 371. У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі — на спецыяльнасці «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» — 373.

Увогуле, 47% абітурыентаў, якія паступаюць у Белдзяржуніверсітэт, маюць сумарны бал, вышэйшы за 300. На факультэт міжнародных адносін падалі дакументы 9 абітурыентаў з сумай балаў больш як 391, на факультэт прыкладной матэматыкі — два, адзін — на факультэт журналістыкі.

СТАР. 3

# ШУКАЦЬ НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## Беларусь разлічвае на рэалізацыю новых буйных праектаў з удзелам кітайскай карпарацыі Citic Group

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з прэзідэнтам карпарацыі Ван Цзюнам, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«У бліжэйшы час, хутчэй за ўсё ў верасні, мы правядзём перагаворы на вышэйшым узроўні ў Пекіне з маім калегам Сі Цзіньпінам. У нас ёсць шырокі парадак дня, шмат пытанняў, якія мы павінны ўзгадніць і вырашыць. Не ўтаю, што мы вельмі разлічваем, што да гэтага часу з вашай кампаніяй нашы міністэрствы і ведамствы, прадпрыемствы і холдынгі не толькі знойдуць тэмы для перагавораў, але і падрыхтуюць праекты дакументаў па рэалізацыі сур'ёзных праектаў у двух краінах і перш за ўсё ў Беларусі», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі ўжо многае зроблена з удзелам карпарацыі Citic Group. «Ваша кампанія — адна з буйнейшых у свеце, і мне дае вялікае задавальненне супрацоўніцтва з такой кампаніяй. Мы ведаем аб стратэгічным характары ўзаемаадносін КНР і Беларусі. І работа вашай кампаніі ў Беларусі арганічна ўплятаецца ў тканіну гэтых адносін», — сказаў Прэзідэнт.

Нягледзячы на пратакольны характар сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка прапанаваў абмеркаваць і шэраг канкрэтных праектаў, пытанняў і праблем, якія, магчыма, існуюць у бакоў пры рэалізацыі сумесных праектаў. «Думаю, гэта трэба сёння зрабіць, каб не было наперадзе нейкіх праблем і недагаворванняў. Калі ёсць праблемы, мы гатовы іх вырашыць вельмі хутка», — запэўніў беларускі лідар.

У сваю чаргу Ван Цзюн адзначыў, што ўсе работы, якія праведзены яго кампаніяй па праектах у Беларусі, у тым ліку ў сферы вытворчасці цэменту, легкавых аўтамабіляў, мадэрнізацыі Аршанскага льнокамбіната, выконваюцца даволі паспяхова. «Адразу пасля прыезду ў Беларусь я наведаў пляцоўку праекта па будаўніцтве аўтамабільнага завода «Белджы» і выслухаў даклады ўдзельнікаў праекта, — сказаў ён. — Мы гарантавана выканаем усю работу і здадзім вам праект да канца гэтага года. І да канца чэрвеня наступнага года таксама здадзім праект па мадэрнізацыі Аршанскага льнокамбіната».

Як расказаў Ван Цзюн журналістам па выніках перагавораў, на праведзеных сустрэчах з Прэзідэнтам і ва ўрадзе Беларусі абмяркоўваліся як ужо рэалізуемыя праекты, так і перспектыўныя планы супрацоўніцтва. «Мы падпісалі дакументы аб супрацоўніцтве па стварэнні вытворчасці спецмашын, сумеснага інвестыцыйнага фонду, вытворчасці ў сферы сельскай гаспадаркі. З цягам часу адкрываюцца ўсё новыя магчымасці для развіцця бізнесу», — адзначыў прэзідэнт карпарацыі Citic Group.

Паводле яго слоў, сумесны інвестыцыйны фонд будзе карысны для адкрыцця магчымасцяў у рэалізацыі праектаў у вытворчай сферы, у тым ліку па стварэнні прадпрыемства па глыбокай перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі.

■ Ва ўрадзе

# БЕСПРЭЦЭДЭНТНЫ ПРАЕКТ

## Беларусь і Кітай ствараюць міжурадавы інвестыцыйны фонд

**Мемарандум аб супрацоўніцтве па яго стварэнні падпісаны паміж Міністэрствам фінансаў Беларусі і кампаніяй Citic Construction Co., Ltd па выніках сустрэчы прэм'ер-міністра Беларусі Андрэя Кабякова з прэзідэнтам кампаніі Citic Group Ван Цзюнам. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

«Гэта будзе беспрэцэдэнтны праект: гаворка ідзе аб стварэнні ў Беларусі першага міждзяржаўнага інвестыцыйнага фонду. Гэта цалкам адпавядае дамоўленасцям кіраўнікоў нашых дзяржаў у маі 2015 года аб развіцці інвестыцыйнага супрацоўніцтва з акцэнтам на прамыя інвестыцыі. Стварэнне фонду — адзін з важных крокаў у адкрыцці новай эпохі ў развіцці беларуска-кітайскага стратэгічнага партнёрства», — адзначыў Андрэй Кабякоў. Паводле яго слоў, на першапачатковым этапе капітал фонду складзе $50 млн. «Гэта невялікая сума, у далейшым капітал будзе залежаць ад попыту беларускіх і кітайскіх кампаній на рэалізацыю сумесных праектаў на тэрыторыі Беларусі», — растлумачыў кіраўнік беларускага ўрада.

Мяркуецца, што да 1 жніўня будзе створана рабочая група, якая да 1 верасня падрыхтуе рамачнае пагадненне, дзе будуць дэталёва прапісаны механізм стварэння, прынцыпы працы і кіравання фондам. Андрэй Кабякоў расказаў, што асноўным кірункам дзейнасці на пачатковым этапе стане суфінансаванне беларуска-кітайскіх інвестыцыйных праектаў, якія рэалізуюцца ў Беларусі пры падтрымцы кітайскіх банкаў, праз прадастаўленне крэдытаў і набыццё акцый беларускіх кампаній.

«Пасля, мяркуецца, фонд павінен выйсці на пошук самастойных праектаў і поўнае іх фінансаванне», — сказаў Андрэй Кабякоў. Ён падкрэсліў, што прыемна працаваць з кампаніяй, якая мае бездакорную рэпутацыю ў Беларусі і ва ўсім свеце. «З задавальненнем канстатую, што адносіны з Citic развіваюцца дынамічна. Мы цэнім, што вашай кампаніяй у Беларусі цяпер рэалізуюцца два найбуйнейшыя праекты — будаўніцтва завода па вытворчасці легкавых аўтамабіляў «Джылі» і мадэрнізацыя Аршанскага льнокамбіната. Агульная сума праектаў — каля $350 млн», — паведаміў прэм'ер-міністр.

Ван Цзюн падзякаваў Андрэю Кабякову за сардэчны прыём і выказаў надзею на далейшае плённае супрацоўніцтва. Таксама ў прысутнасці Андрэя Кабякова і Ван Цзюна падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» і Citic Construction Co., Ltd аб супрацоўніцтве ў галіне сельгасмашынабудавання, мемарандум аб супрацоўніцтве паміж ЗАТ «Абсалютбанк» і Citic Construction Co., Ltd, мемарандум аб стварэнні сумеснага сельскагаспадарчага холдынга паміж ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» і Citic Group.

**Мікалай ПЯТРОЎ**

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

**Беларусь надае вялікае значэнне сяброўскім і ўзаемавыгадным адносінам з Рэспублікай Карэя, адзначыў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Карэя ў Беларусі КІМ ЁНГ ХО.**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама падкрэсліў, што вялікую ролю ў эфектыўным узаемадзеянні можа выканаць парламенцкая дыпламатыя і асабісты дыялог паміж кіраўнікамі парламентаў. Гэта дазволіць вырашаць прыярытэтныя задачы, да якіх магчыма аднесці развіццё гандлёва-эканамічнага, культурнага ўзаемадзеяння, супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі.

«Асаблівае месца займае кааперацыя ў сферы інфармацыйных тэхналогій і вытворчасці высокатэхналагічных тавараў, у чым Карэя з'яўляецца лідарам», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер таксама лічыць, што важнае значэнне ў наладжванні міжпарламенцкіх адносін і развіцці сувязяў маюць групы дружбы ў парламентах краін. Ён нагадаў, што ў Беларусі такая група працуе, і выказаў надзею, што ў хуткім часе аналагічная будзе сфарміравана ў нядаўна выбраным парламенце Карэі. Акрамя таго, ён падкрэсліў, што для далейшай эфектыўнай сумеснай працы ў двух бакоў ёсць усе падставы і створана адпаведная нарматыўна-прававая база.

Кім Ёнг Хо ў сваю чаргу падкрэсліў, што Беларусь і Карэя маюць вялікую колькасць высокакваліфікаваных спецыялістаў у сферы інфармацыйных тэхналогій, і ў гэтым ён бачыць патэнцыял для супрацоўніцтва і прыцягнення карэйскіх інвестыцый у нашу краіну.

«Рэспубліка Карэя паспяхова вырабляе саму тэхніку, а Беларусь можа распрацоўваць праграмнае забеспячэнне да яе», — сказаў Кім Ёнг Хо.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Выбары-2016

# У актыўную фазу

## Перайшлі выбары ў верхнюю палату парламента

**Сёння, 21 ліпеня, пачалося вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі шостага склікання. Вылучыцца ахвотныя змогуць да 19 жніўня ўключна.**

«21 ліпеня пачынаецца актыўная фаза паралельнай (у дачыненні да Палаты прадстаўнікоў. — **«Зв.»**) выбарчай кампаніі — па выбарах членаў Савета Рэспублікі. Як вам вядома, гэта верхняя палата нашага парламента. Гэтыя асобы будуць выбірацца дэпутатамі мясцовых Саветаў базавага ўзроўню», — заявіла **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў,** у сваім нядаўнім тэлезвароце на інтэрнэт-партале «Выбары-2016» (vybory2016.by).

Вылучаць кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі могуць прэзідыумы раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) Саветаў дэпутатаў і раённыя, гарадскія выканаўчыя камітэты, прэзідыум Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў і Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт. Выбіраць членаў Савета Рэспублікі будуць дэпутаты мясцовых Саветаў базавага ўзроўню ў кожнай вобласці і Мінскага гарадскога Савета.

Дакументы аб вылучэнні павінны быць пададзены ў трохдзённы тэрмін пасля вылучэння. Пасля чаго Цэнтральная камісія праверыць адпаведнасць парадку вылучэння кандыдатаў у члены верхняй палаты парламента патрабаванням выбарчага заканадаўства.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ЕРЭВАН. Чацвёртыя суткі — перамовы з перапынкамі...

## Здаецца, тыя, што захапілі будынак, усё яшчэ спадзяюцца, што будзе падтрымка з боку насельніцтва

■ У свеце




**Усё здарылася раніцай 17 чэрвеня, каля 5.30, у паўднёвым раёне Ерэвана Эрэбуні, дзе размяшчаецца полк унутраных сіл патрульна-паставой службы паліцэйскага ўпраўлення Рэспублікі Арменія. Група асоб, узброеных аўтаматычнай зброяй і выбухоўкай (як мяркуецца — баявымі гранатамі), прабілі жалезныя вароты на ўездзе на тэрыторыю палка і прапанавалі службе аховы здацца. Завязаўся кароткі, але жорсткі бой.**

У выніку чацвёра супрацоўнікаў паліцыі паранения, забіты намеснік начальніка палка патрульна-паставой службы Артур Ванаян. Ужо потым, калі захопнікі будынка ППС з дапамогай сацсетак распаўсюдзілі заяву з заклікам да насельніцтва іх падтрымаць, стала ясна, што тыя, хто напаў — гэта група «Сасна црэр» — прыхільнікі і аднадумцы каардынатара армянскай апазіцыйнай грамадзянскай ініцыятывы «Устаноўчы парламент» Жырайра Сефіляна, не так даўно арыштаванага за незаконнае захоўванне, нашэнне і набыццё агнястрэльнай зброі.

Дакладная колькасць захопнікаў пакуль невядомая. Сам камандзір атрада Павел Манукян сказаў, што ў яго распараджэнні каля роты падрыхтаваных байцоў. Некаторыя крыніцы неафіцыйна называлі канкрэтную лічбу — 24 чалавекі, з якіх адзін моцна паранены. Ён знаходзіцца ў кабіне «КрАЗа», якім таранілі жалезныя вароты палка ППС, моцна ўдарыўся і страціў шмат крыві.

Нападнікі зачыніліся за сценамі захопленага будынка. Там жа былі 8 паліцэйскіх, з якіх чацвёра былі паранены падчас бою. Туды ж потым прыйшоў і намеснік начальніка гарадской паліцыі Валерый Асіпян, які здаў зброю нападнікам і заявіў, што не пакіне будынак да таго часу, пакуль хоць адзін з яго падначаленых знаходзіцца ў закладніках.

У першы дзень падзеі развіваліся імкліва. Паліцыя перакрыла кардонамі, бранятэхнікай і цяжкімі грузавікамі ўсе праходы да захопленага будынка. Кіраўніцтва армянскай паліцыі пачало перамовы па вызваленні закладнікаў, умовах раззбраення захопнікаў і іх здачы праваахоўным органам. На працягу трохсутачных перамоў атрымалася вызваліць пяць чалавек. Была таксама аказана медыцынская дапамога нападаючаму, які пры захопе будынка страціў шмат крыві.

Сітуацыя ўскладняецца некалькімі сур'ёзнымі абставінамі.

Па-першае, у будынку ППС знаходзіцца арсенал, у якім захоўваецца вялікая колькасць агнястрэльнай зброі.

Па-другое, нападнікі адразу ж выставілі менавіта палітычныя патрабаванні, у якіх адстаўка дзейнага прэзідэнта Арменіі Сержа Саргсяна і вызваленне з турмаў усіх асуджаных «па палітычных матывах»...

Па-трэцяе, кіраўніцтва ўзброенай групы, якая захапіла будынак, на нейкім этапе адмовілася працягваць перамовы, пакольі да іх не прывялі іх лідара — таго самага Жырайра Сефіляна, раней арыштаванага. Аднак самае цікавае заключаецца ў тым, што адзін з членаў узброенай групы Павел Манукян, які гутарыў з Сефілянам па тэлефоне, паведаміў, што той параіў сваім прыхільнікам самім вырашаць, што рабіць далей.

«Жырайр Сефілян не ведаў ні аб чым. Я прадставіў сітуацыю, расказаў пра тое, што здарылася. Але ён быў не ў курсе, таму сказаў: «Вырашайце самі», — паведаміў Манукян газеце «Жохавурд».

На другі дзень захопу ў горадзе пачалі развівацца падзеі іншага кшталту. Прадстаўнікі некалькіх маладзёжных і праваахоўных арганізацый празаходзіўся толку прыклалі максімум намаганняў, каб падняць людзей у падтрымку групы нападнікаў.

Каля 200—300 чалавек (пераважна моладзь) выйшлі на ерэванскую плошчу Свабоды і правялі мітынг. Пасля сутыкнення з паліцыяй мітынгоўцы прайшлі маршам па цэнтры горада, пасля чаго найбольш актыўная частка размясцілася своеасаблівым лагерам прама перад паліцэйскімі кардонамі, якія ачапілі захоплены будынак ППС. Так яны і правялі ўсю ноч — адны насупраць другіх — невялікая група мітынгоўцаў і пастроеныя ў два рады атрады паліцэйскага спецназа.

Прэзідэнт Арменіі Серж Саркісян на надзвычайным пасяджэнні, скліканым у дзень захопу, жорстка загадаў кіраўніцтву сілавых структур зрабіць усё магчымае, каб не пралілася кроў.

Перамовы працягваліся 20 ліпеня. Сітуацыя вельмі складаная і неадназначная: захопнікі ўсё яшчэ спадзяюцца, што народ усё ж такі выйдзе з дамоў і прыйдзе да іх на падтрымку. У сваю чаргу, улады краіны робяць усё магчымае, каб пазбегнуць абвастрэння сітуацыі, і спадзяюцца вырашыць яе максімальна мірным шляхам. Ну а армянская грамадскасць, у большасці сваёй, асуджае дзеянні ўзброенай групы і лічыць непрымальным вырашэнне палітычных пытанняў краіны недэмакратычным шляхам. На маю думку, куратарамі нападзення на ППС у Ерэване з'яўляюцца не ўнутраныя, а знешнія сілы. Занадта ж падобныя сцэнары трагічных інцыдэнтаў у Арменіі і Казахстане, якія здарыліся ледзь не дзень у дзень. Можна меркаваць, што гаворка ідзе пра спробы дэстабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў двух краінах — членах ЕАЭС. А з улікам небяспечнай сітуацыі ў Турцыі, якой яшчэ доўга расхлёбваць наступствы няўдалага путчу, зразумела, што цяпер сярэднеазіяцкі і каўказскі рэгіёны апынуліся ў эпіцэнтры складанай геапалітычнай гульні — ураўненні з некаторымі вядомымі і шматлікімі невядомымі.

**Ірына АБРАЯН,**
*г. Ерэван*

# НІБЫ КАЗАЧНЫ ЦЕРАМОК

## У Салігорску будуецца ўнікальны цэнтр для дашкольнікаў



**Самы вялікі на Міншчыне дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці ў хуткім часе з'явіцца ў Салігорску. Установа ўзводзіцца на сродкі ААТ «Беларуськалій».**

— Ужо пабудавана каробка, накрыты дах, выкананы электрамантажныя, сантэхнічныя работы, — уводзіць у курс справы **начальнік будаўнічага ўпраўлення №123 ААТ «Будтрэст №3 ордэна Кастрычніцкай рэвалюцыі» Дзмітрый КАРТУЗ.** — Будаўніцтва ідзе хуткімі тэмпамі: пачалося ў снежні мінулага года. Усе намаганні накіраваны на тое, каб здаць аб'ект у жніўні сёлета. Цяпер тут працуе больш як 400 чалавек.

Паралельна вядуцца добраўпарадкаванне тэрыторыі, азеляненне, вакол пасеяна трава. «Думаю, да адкрыцця паспеем зрабіць пару ўкосаў», — жартуе Дзмітрый Міхайлавіч.

Дзіцячы сад будуецца па індывідуальным праекце, распрацаваным інстытутам «Брэстпраект», з якім у акцыянернага таварыства склаліся дзелавыя стасункі. Па-першае, кошт паслуг абыходзіцца ў разы танней, чым у іншых аналагічных арганізацыях. Па-другое, тут да справы падыходзяць творча, заўсёды знаходзяць цікавыя архітэктурныя рашэнні. Дзіцячы цэнтр уяўляе сабой тры злучаныя паміж сабой карпусы, упрыгожаныя невялікімі вежамі, і нагадвае казачны церамок.

Кошт аб'екта 84 млрд рублёў. Напачатку яго планавалася пабудаваць за 14 месяцаў, затым вырашылі ўзвесці за 8,5 месяца. «Гэта будзе наш падарунак малым і іх бацькам да прафесійнага свята — Дня шахцёра, які адзначаецца 27 жніўня», — кажа **намеснік генеральнага дырэктара па капітальным будаўніцтве ААТ «Беларуськалій» Іван ЖДАНОВІЧ.**

**Загадчыца дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці «Планета дзяцінства ААТ «Беларуськалій» г. Салігорска Іна МАРШЫЦКАЯ** не ўтойвае сваіх эмоцый і радасці:

— Наш цэнтр разлічаны на 330 дзяцей. У ім адначасова размесціцца 17 груп. Ён адрозніваецца ад тыпавых дзіцячых дашкольных устаноў. Тут прадугледжаны інтэрактыўны пакой, легацэнтр, гульнявыя пакоі з лабірынтамі для дзяцей ад 1 года да 3-х і ад 3 гадоў да 7-мі. Задума галоўнага архітэктара праекта — зона рэкрэацыі ў 150 кв. метраў са сцэнай, прызначаная для сумесных мерапрыемстваў бацькоў і дзяцей, свят, «агеньчыкаў», ранішнікаў, творчых сустрэч. Яшчэ адна цікавінка — на падлозе шахматная дошка і шахматы ў рост дзіцяці. Тут будуць таксама створаны спецыяльныя ўмовы для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, цяжкімі парушэннямі мовы. З імі будуць працаваць логапеды, дэфектолагі. Практычна ўжо сфарміраваны штат супрацоўнікаў. З 1 жніўня да нас прыязджаюць маладыя спецыялісты, якіх мы адабралі на размеркаванні ў Дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. Гэта ініцыятыўныя дзяўчаты і хлопцы з цікавымі ідэямі, метадамі, якія яны прыўнясуць у работу ўстановы.

Дашкольны цэнтр размясціўся ў 17-м мікрараёне Салігорска, дзе пражывае практычна палова работнікаў флагмана айчыннай вытворчасці. Менавіта іх дзеці і будуць наведваць установу. Гэта вельмі зручна для бацькоў: не трэба рана будзіць выхаванца, каб адвезці ў сад і паспець на працу. Усё побач, пад бокам. Тым больш што на «Беларуськаліі» работа арганізавана ў тры змены.

— Клопат аб работніках і іх дзецях у нас на першым плане, — канстатуе Іван Ждановіч. — Летась у новы арэндны дом засялілі сем'і, якія сталі на чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў на прадпрыемстве. Сёлета ў канцы мая да Дня хіміка здалі яшчэ адзін 160-кватэрны шматпавярховік. Абодва знаходзяцца побач з дзіцячым цэнтрам.

Акрамя таго, у падпарадкаванні прадпрыемства — санаторый «Бярозка», які, так бы мовіць, зжыў сябе фізічна і маральна. Замест яго ўзводзіцца новая здраўніца найвышэйшага класа па абслугоўванні і камфорце.

— Нашы людзі добра працуюць. Яны заслужылі таго, каб і добра адпачываць, — рэзюмаваў Іван Ждановіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

**З ходам будаўніцтва дзіцячага цэнтра азнаёміўся <u>старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ</u> падчас рабочай паездкі ў Салігорск. Міхаіл Уладзіміравіч адзначыў, што Салігорск атрымае ўнікальную дашкольную ўстанову з цудоўнымі ўмовамі. І галоўнае — тут будзе ўдзяляцца вялікая ўвага ўсебаковаму развіццю дзяцей. «На V Усебеларускім народным сходзе ішла размова аб адукацыі праз усё жыццё, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Упэўнены, што гэты цэнтр дазволіць закладці добры падмурак для далейшай адукацыі яго выхаванцаў».**



Фота БЕЛТА.

■ Чулі?!

# УСПОМНІМ ВЫСОЦКАГА

## У Навагрудку з'явіцца гасцінічны нумар імя славутага акцёра і барда

**Нумар у гасцініцы «Навагрудак», дзе ў свой час спыняўся Уладзімір Высоцкі, стане тэматычным. Яму прысвояць імя паэта і выканаўцы і ўрачыста адкрыюць 24 ліпеня, у дні правядзення рэгіянальнага фестывалю-конкурсу бардаўскай песні памяці Уладзіміра Высоцкага «Музыка сэрцаў».**



У. Высоцкі і М. Уладзі на Навагрудчыне. 1969 г.

Уладзімір Высоцкі жыў у Навагрудку ў жніўні 1969-га падчас здымак фільма «Сыны ідуць у бой». Спачатку ён пасяліўся ў гатэлі, а затым перабраўся ў прыватны дом на беразе возера Літоўка, куды да яго прыехала Марына Уладзі. Яны былі натхнёныя прыгажосцю і гісторыяй навагрудскай зямлі. Марына Уладзі пісала ў сваіх успамінах, што менавіта тут нарадзіліся тэмы бальшасці песень ваеннага цыкла Высоцкага. Сёння вядомае возера, апетае яшчэ Адамам Міцкевічам у паэме «Гражына», з'яўляецца цэнтрам турыстычнага маршруту «Сляды рамантыкаў і герояў». На беразе з'явіўся сквер памяці Высоцкага, а турысты любяць зазірнуць у прыватны двор, дзе начавалі закаханыя.

Там была закінутая хата, дзе здымалася шмат сцэн для карціны «Сыны ідуць у бой». «Мы здымалі пад Навагрудкам, ля возера Свіцязь, — расказваў потым рэжысёр Віктар Тураў. — Дык вось, сустрэў я Валодзю і Марыну ў Баранавічах і прывёз на гэтае возера. Была нядзеля, з Баранавіч і Навагрудка панаехала шмат адпачывальнікаў. Ну і як гэта заўсёды ў групе бывае, хтосьці пахваліўся перад кімсьці, што да нас прыедуць Высоцкі і Марына Уладзі. І па пляжы, па возеры пачаліся такі шоргат, шум...

Яны прыехалі, змучаныя фестывалем і дарогай. У мяне быў здымачны дзень, акрамя таго, трэба было зрабіць сякія-такія справы... Я пакінуў іх адных пагуляць у лесе ўздоўж возера. Раптам да мяне прыбягае хтосьці з групы і кажа: «Ведаеш, там біць збіраюцца Высоцкага і Уладзі!» — «Чаму? Што здарылася?» — «А іх, кажуць, прынялі за самазванцаў, таму што ніхто не паверыў, што вось гэтыя двое — Высоцкі і Уладзі». Чамусьці ў тагачаснай публікі існавала ўяўленне, што Высоцкі — вялізнага росту, са шрамам на твары і іншае, і іншае, і іншае. Марына Уладзі ў сваім сціплым някідкім строі выглядала проста абаяльнай жанчынай. Натуральна, яны далёка не цягнулі на гэтакіх суперменаў, якімі яны былі ва ўяўленні нейкай часткі публікі. Гэта спарадзіла падазронасць, і вось за «самазванства» маіх гасцей ледзь не адлупілі».

Сам фестываль разгорнецца на беразе возера 23-24 ліпеня. У ім возьмуць удзел беларускія аўтары і выканаўцы песень, творчыя калектывы, асноўным напрамкам дзейнасці якіх з'яўляецца захаванне і падтрыманне традыцый бардаўскай музыкі. Удзельнікі паселяцца ў намётавым мястэчку, запланавана конкурсная праграма і канцэрты, сяброўскія сустрэчы ля вогнішча.

Бардаўскія песні будуць ядром свята. Таксама гасцей чакае «Бард-юшка» з майстар-класам па гатаванні галоўнай бардаўскай стравы і танцавальна-забаўляльная праграма. Будзе дзейнічаць кніжная выстаўка «Чалавек, паэт, акцёр», прысвечаная Высоцкаму, і фотавыстаўка «Навагрудак у 60-я».

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**
*slaneuski@zviazda.by*

■

## 100 вакантных бюджэтных месцаў...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах **першага намесніка міністра адукацыі Вадзіма БОГУША,** дзякуючы актыўнай прафарыентацыйнай рабоце на дзённай бюджэтнай форме навучання вакантных засталося крыху больш за 100 месцаў (у 2015 годзе незапоўненымі заставалася 391 месца). На вячэрняй форме ўсе бюджэтныя месцы запоўненыя.

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на ўсіх спецыяльнасцях з бюджэтнымі месцамі склаўся конкурс. Самы высокі — 12,5 чалавека на месца — зафіксаваны на спецыяльнасці «Спартыўна-турысцкая дзейнасць (менеджмент у турызме)». Конкурс 8 чалавек на месца склаўся на спецыяльнасці «Спартыўна-педагагічная дзейнасць (спартыўная рэжысура)» і 7 чалавек на месца — на спецыяльнасці «Псіхалогія».

Вакантныя месцы ёсць у Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце, Магілёўскім дзяржаўным універсітэце, Віцебскім тэхналагічным універсітэце...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору ў большасці ВНУ будзе весціся тры дні: з 26 па 28 ліпеня, у творчых ВНУ — з 29 па 30 ліпеня, у ВНУ сілавых ведамстваў — з 24 па 26 ліпеня. Залічэнне ў кола студэнтаў пройдзе не пазней за 31 ліпеня. У ВНУ сілавых ведамстваў — па 27 ліпеня.

**Мінімальныя балы па прадметах ЦТ, з якімі можна будзе паступаць у рамках дадатковага набору, зніжацца не будуць!** Яны такія ж, як і мінімальныя балы, устаноўленыя для асноўнага набору. На вакантныя месцы змогуць прэтэндаваць абітурыенты, якія не прайшлі па конкурсе пры паступленні ў іншыя ВНУ, але маюць на руках патрэбныя сертыфікаты або паступалі на іншыя спецыяльнасці ў тую ж ВНУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# Такога торфу няма больш нідзе

**Карэспандэнтка «Звязды» сустрэлася з Міхаілам Шутам, дырэктарам торфапрадпрыемства «Глінка» (Столінскі раён Брэсцкай вобласці), дзе здабываецца самы лепшы ў Еўропе торф. Ён расказаў, што завод быў утвораны ў 1948 годзе, летась быў адкрыты новы цэх. На яго будаўніцтва пайшло 80 мільярдаў беларускіх рублёў, плюс 1,7 мільёна еўра чэшскай кампаніі «Рашэліна» пайшло на абсталяванне.**

— Самае галоўнае, што яшчэ на старой вытворчасці мы пачалі працаваць на Еўропу, — кажа ён. — Тут у нас ужо больш якасны торф і, адпаведна, больш сур'ёзныя намеры. Тым больш, што ў нас устаноўлена чэшская лінія па расфасоўцы торфу. Цікавасць да нашай прадукцыі ёсць з боку палякаў, немцаў, чэхаў.

Па словах Міхаіла Шута, торфапрадпрыемства «Глінка» падпарадкоўваецца «Белпалівагазу».

— Чэшская кампанія нам паставіла абсталяванне, — паведаміў ён. — Але ў перспектыве — да 2020 года — чэшскія інвестары хочуць стаць нашымі акцыянерамі.

Здабыча торфу — няпростая справа:

— Некаторыя думаюць, што здабываць торф нескладана — проста нагроб рыдлёўкай, — усміхаецца дырэктар прадпрыемства. — Але гэта не так. Для таго, каб здабыць торф, трэба прыбраць усе дрэвы, пасля трэба пракапаць меліяратыўную сетку, пасля зрабіць дробнае карчаванне — дастаць пнякі з зямлі. Тэрыторыя, з якой слой торфу ўжо зняты, пасля затапліваецца вадой, і там натуральным спосабам фарміруецца балота.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ЧАСОВЫ ПРЫТУЛАК ДЗЯЦІНСТВА


На свяце ў прытулку.

**Летам не ўсе дзеці могуць правесці час з бацькамі і роднымі. У віцебскай установе якраз такія...**

## Неабавязкова з праблемных сем'яў

Афіцыйна прытулак мае назву «Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сацыяльна-педагагічны цэнтр г. Віцебска». Знаходзіцца бліжэй да ўскраіны абласнога цэнтра па адрасе: Залатагорская, 5а. Адно з двух аддзяленняў — дзіцячы сацыяльны прытулак.

Напэўна, многія думаюць, што ў такія ўстановы трапляюць дзеці, скажам так, з праблемных сем'яў. Не без гэтага. Дзіця накіруюць сюды, калі яно знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Гэта вынік таго, што бацькі выпіваюць, дома няма нармальных умоў для пражывання малога. Ёсць і іншыя прычыны.

— У нас выхаванцы ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў. Тэрмін іх знаходжання да 6 месяцаў — да моманту рашэння пытання іх ўладкавання. Прыярытэт — вяртанне дзяцей дамоў да біялагічных бацькоў. Але апошнія павінны прыкласці ўсе сілы для ліквідацыі няшчасця ў сям'і. Павінны «завязаць» са спіртным, працаўладкавацца, зрабіць рамонт у доме і падобнае. Калі не атрымаецца вярнуць дзяцей дадому, нашы спецыялісты аказваюць дапамогу органам апекі і папячыцельства раённых аддзелаў адукацыі горада ў пошуку для дзяцей усынавіцеляў, апекуноў, прыёмных бацькоў. І толькі ў тым выпадку, калі іх знайсці не атрымаецца, дзяцей накіроўваюць у дзіцячы дом, — тлумачыць **кіраўнік установы Ірына ІСАЧЭНКА.**

Але розныя сітуацыі бываюць. Мінскія хлопчыкі прыехалі да сяброў у Віцебск. Не было грошай з'ехаць назад. Да міліцыянераў падышлі, тыя змясцілі дзяцей у прытулак. На другі дзень іх забралі бацькі.

— А вось яшчэ рэальны прыклад. Згарэў дом. Мама ў ім жыла з трыма сынамі. Маму размясцілі суседзі, а дзяцей — у прытулак. Потым гэтай сям'і апякунскі савет установы дапамагаў уладкавацца ў інтэрнат, зрабіць рамонт, купіць мэблю і бялізну, — расказвае дырэктар.

Бывае, мамы самі прыводзяць дзяцей у прытулак. Напрыклад, калі трэба ў бальніцу на аперацыю, а сваякоў у горадзе няма.

## «Сірыйскі след»

Іншаземцы ў прытулку не рэдкасць. Геаграфія шырокая.

— Нарад міліцыі ўвечары ўбачыў на вуліцы хлопчыка. Рускую мову не ведае. Куды адзін ідзе? Прывезлі ў прытулак. Дык і англійскую не ведаў. Што рабіць? Выручыў студэнт з Сірыі, які ў Віцебску вучыўся ў медыцынскім універсітэце. Той па мабільным тэлефоне пытаў нашага маленькага госця і на ломаны рускай мне перакладаў. Нашых дзяцей той малы ўразіў. Яны былі ў захапленні. Дапамагалі хлопчыку рускую мову вучыць, а самі — яго родную, — успаміне сураэмоўца.

Аказалася, што юны сірыец прыехаў з дзядзькам. Па дыпламатычным канале потым былі расстаўленыя ўсе кропкі над «і». Хлопчыка перадалі сваякам.

Дырэктар неадназрова падкрэслівала, што выхаванцы вельмі дружныя. Навічка сустракаюць разам. Паказваюць усё. Старшыя шэфствуюць над малымі. Тут усе, як браты і сёстры. Напэўна, цяжкасці ў жыцці, адсутнасць бацькоў збліжаюць.

А яшчэ быў 17-гадовы рускамоўны хлопчык з Ізраіля. Ён вельмі хацеў застацца ў Беларусі. Не атрымалася. Калі яму споўнілася 18, яго дэпартавалі.

— Я з цеплынёй успамінаю іншага — 5-гадовага, мама якога з Латвіі пераехала. Выпівала... Пакуль бацька хлопчыка пералічваў грошы, было чым карміць і ў што апранаць сына. Калі дапамога скончылася, жанчына ў органы апекі звярнулася. Прасіла, каб прытулілі дзіця часова. Але доўгі час не забірала... Ён такі разумны, як маленькі мужычок. Сказаў, што ўсё ведае, бо тэлевізар глядзеў, пакуль мама «сваімі справамі» займалася, — як пра сына гаворыць Ірына Ісачэнка.

## І працуюць з апекунамі

У прытулку не толькі часова выхоўваюць дзятву. Другое аддзяленне ўстановы — дыягностыкі і рэабілітацыі непаўналетніх.

— Аддзяленне аказвае сацыяльную, псіхалагічную і іншую дапамогу непаўналетнім, іх бацькам, усынавіцелям, апекунам, папячыцелям у ліквідацыі цяжкай жыццёвай сітуацыі.

Таксама распрацоўвае і распаўсюджвае тэхналогіі работы з дзецьмі і сем'ямі, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — працягвае дырэктар.

Тут праводзяць кансультаванне, у тым ліку ананімнае і па тэлефоне, непаўналетніх і іх бацькоў, каб дапамагчы знайсці выхад са складанай жыццёвай сітуацыі, папярэдзіць гвалт над дзецьмі. Аддзяленне ажыццяўляе пошук, падбор і падрыхтоўку сем'яў, якія прымаюць на выхаванне непаўналетніх, што засталіся без апекі бацькоў. Рыхтуе дзяцей да пераходу на выхаванне ў сям'і.



Дырэктар Сацыяльна-педагагічнага цэнтра г. Віцебска Ірына ІСАЧЭНКА ўдзячна любым праявам увагі да сваіх падапечных (кошт падарункавага сертыфіката — у недамінаваных рублях).

## Шасціразовае харчаванне

Мы прайшліся па прытулку. Будынак узвялі ў 1960-я гады. Былы дзіцячы садок. У спальных пакоях ад 6 да 8 чалавек. А ўсяго прытулак можа змясціць 35 гадаванцаў.

Ёсць залы для правядзення мерапрыемстваў, сталовая... Ва ўстанове, дарэчы, кормяць шэсць разоў штодня. Ёсць і пакой для спатканняў з бацькамі, сваякамі.

Падчас вучэбнага года дзеці прачынаюцца ў 7 гадзін раніцы. У школу ўсіх выхаванцаў прытулку абавязкова, незалежна ад узросту, суправаджае супрацоўнік. Займаюцца ў звычайнай школе, якая недалёка. Некаторыя — ва ўстановах, дзе вучаць дзяцей з асаблівасцямі развіцця. З 13 да 14 гадзін — абед. З 14 да 16 гадзін дня выхаванцы спяць. Потым — дамашнія заданні і наведванні бацькоў. Адбой у 21.00.

Летам трохі іншы расклад. Выхаванцаў часта запрашаюць бясплатна наведаць цырк, кіно, шоу ў палацы зімовых відаў спорту і гэтак далей... Шмат часу летам яны праводзяць у двары.

## Патрэбныя... зубачысткі

Многія супрацоўнікі разам з дырэктарам — былыя калегі па школе. Таму калектыў у прытулку дружны. Выпадковых людзей няма. Як сказалі супрацоўнікі, дырэктар — начальнік душэўны і кіраваць умее, не павышаючы голасу, без ціску, з павагай. А пацвярджэнне таго, што дзецям тут добра, візіты былых выпускнікоў. Яны і падчас канцэртаў выступаюць.

Рукі ў супрацоўніц прытулку залатыя, яны навучаюць дзятву рабіць сувеніры. Ды з чаго! З кардонных «падставак» для яек, палачак для шашлыкоў, зубачыстак... Дарэчы, быў здзіўлены, што з задавальненнем у прытулку прымуць у дар зубачысткі. Каб быў матэрыял для творчасці.

Прытулку дапамагаюць. Калі прасіў адзначыць самых шчодрых, надзейных мецэнатаў, дырэктар прамаўчала. Усе аднолькава каштоўныя. Ёсць і людзі з сярэднім заробкам, якія пытаюцца, чым дапамагчы...

Бывае, пасля ЗАГСа маладыя і сваякі прыязджаюць у прытулак і ўручаюць выхаванцам падарункі. Калі мы гутарылі з дырэктарам, прадстаўнікі дапрачыннай інтэрнэт-суполкі прапанавалі дапамогу — арганізаваць загарадную паездку.

Большасць з нас выраслі ў нармальных сем'ях, жывуць у кватэрах з усімі выгодамі, маюць аўто і дачу. І ўсе чамусьці скардзяцца.

Дзецям з прытулку дзяліць няма чаго. Больш за ўсё ім хочацца вярнуцца да таты і мамы. Каб тыя не пілі, не білі, а толькі любілі іх...

На асфальце каля будынка шмат малюнкаў з прызнаннямі ў любові да... работнікаў установы. Можна прачытаць: «Прытулак. Мы цябе ніколі не забудзем!», «Мы вернемся сюды!», «Дзякуй за ўсё!». Насамрэч, такія шчырыя словы дарагога каштуюць.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА і з архіва ўстановы.**

# ПЕРАМАГЧЫ БОЛЬ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

***— Аднак існуе ў грамадстве і такое меркаванне...***

— Існуе, вядома, аднак ці магчыма на ягo арыентавацца? Стаўленне да хворых і нямоглых — гэта ацэнка ўсяго грамадства пэўнай дзяржавы. Калі чалавек трапіў у складаную сітуацыю, то неабходна прыйсці яму на дапамогу. А ў выпадку з хранічна хворымі людзьмі такая дапамога павінна быць неадкладнай.

***— Між тым у шэрагу заходніх краін дазволена эўтаназія. Ці няма тут пэўнай супярэчнасці?***

— У нашай краіне эўтаназія забаронена законам, у тым ліку і пасіўная, якая тлумачыцца як неналежнае аказанне неабходнай медыцынскай дапамогі. Гэта апраўданая пазіцыя дзяржавы, бо за жыццё варта змагацца і пры нараджэнні (узровень дзіцячай смяротнасці, дарэчы, у нас адзін з самых нізкіх не толькі ў Еўропе, а і ва ўсім свеце), і ў крытычным становішчы. Жыццё — найвялікшая каштоўнасць. Ды і кожнаму з тых, хто адносіць сябе да крытычна настроеных у дачыненні да належнага медыцынскага суправаджэння невылечна хворых людзей, магу сказаць адно: а вы ўявіце сябе ці сваіх родных на іх месцы. Якія ў такім выпадку будуць ацэнкі? Так, гэта дзяржаўныя выдаткі, але яны, пагадзіцеся, апраўданыя.

***— Вольга Віктараўна, айчынны досвед паліятыўнай дапамогі, наколькі мне вядома, пачаў свой адлік у 2000-я. Што тут з'явілася штуршком?***

— Рашэнне Мінгарвыканкама аб стварэнні хоспіса для дарослага насельніцтва было прынята ў 2005-м. Гэтаму папярэднічаў удалы беларуска-аўстрыйскі пілотны праект па аказанні паліятыўнай дапамогі, які быў сфакусаваны на праблеме болю. У краіне ў сярэдзіне 2000-х налічвалася каля 40 тысяч анкалагічных хворых у тэрмінальнай стадыі. Адпаведна, ісанавала патрэба іх належнага медыка-сацыяльнага суправаджэння, якую неабходна было вырашаць праз стварэнне паўнавартаснай сістэмы аказання паліятыўнай дапамогі. Загад Міністэрства аховы здароўя аб арганізацыі паліятыўнай дапамогі даросламу насельніцтву падпісаны ў 2011 годзе. Заканадаўча тэрмін «паліятыўная медыцынская дапамога» быў акрэслены Законам «Аб ахове здароўя» ў 2014-м. Так што дэ-юрэ сфера была вызначана зусім нядаўна.

***— Атрымліваецца, што амаль дзесяцігоддзе — з 2005 па 2014 год — развіваўся глабальны айчынны пілотны праект па паліятыве?***

— Можна і так сказаць, галоўнае — напрацоўваўся каштоўны практычны досвед. Зразумела, мы не імкнуліся тут «вынайсці веласіпед» — існаваў пэўны сусветны вопыт у гэтай сферы. Першая праблема, якую вырашае паліятыўная дапамога — максімальнае змяншэнне альбо поўная ліквідацыя паталагічных сімптомаў, якія перашкаджаюць чалавеку жыць. Ужо пасля дадаецца сацыяльны аспект — праз удзел святароў, валанцёраў, грамадскіх арганізацый (канешне, гэты духоўны аспект не менш важны, чым уласна медыцынскі).

Мы пачыналі з распрацоўкі клінічнага пратакола лячэння болю, якога дагэтуль не было. Між тым Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя ён быў зацверджаны яшчэ ў 1986 годзе. Выйшлі на Еўрапейскую асацыяцыю паліятыўнай дапамогі. Пры іх падтрымцы выпусцілі пратакол, пачалі працаваць. Міжнароднае супрацоўніцтва з даволі вялікай геаграфіяй — Галандыя, Швецыя, ЗША, Польшча, Францыя, шэраг іншых краін. Варыянтаў развіцця паліятыўнай дапамогі насамрэч існуе шмат, варта выбраць той, што найбольш падыходзіць, і развіваць яго. У кожнай справы павінен быць лідар, рухальная сіла. Так і тут. Мяркуючы па выніках, мы не памыліліся, калі зрабілі стаўку на развіццё паліятыўнай дапамогі. З цягам часу заўважна правільнасць выбару.

***— Што сёння ўяўляе сабой айчынная сістэма аказання паліятыўнай дапамогі?***

— У нашай краіне паліятыўная медыцынская дапамога аказваецца стацыянарна і амбулаторна. У Беларусі працуюць 15 хоспісаў і аддзяленняў паліятыўнай медыцынскай дапамогі ў складзе шматпрофільных бальнічных арганізацый. Таксама цяпер налічваецца 9 выязных патранажных службаў, 10 спецыялізаваных кабінетаў, а таксама 3 аддзяленні дзённага знаходжання. Ну і, канешне ж, дапамога грамадскасці — святароў, валанцёраў, грамадскіх арганізацый, фундатараў.

Як бачым, сапраўды створана цэлая сістэма аказання паліятыўнай медыцынскай дапамогі. Сярод рэгіёнаў хачу адзначыць Віцебскую вобласць, дзе фіксуецца актыўнае развіццё адпаведнай сеткі і, зразумела, павелічэнне даступнасці паслуг. Дарэчы, летась патрэбу ў аказанні паліятыўнай дапамогі ў Беларусі мелі 14 тысяч чалавек, атрымалі яе — 8,6 тысячы (60 %).

Зразумела, калі параўноўваць 2010 і 2015 гады, то дынаміка заўважная — рост у разы. Гэта, дарэчы, адзначыла і Сусветная арганізацыя аховы здароўя, якая разам з Еўрапейскай асацыяцыяй паліятыўнай дапамогі склала атлас, дзе краіны ацэньваліся. Беларусь апынулася ў сярэдзіне рэйтынгу са 150 дзяржаў. А яшчэ некалькі гадоў таму мы былі «белай плямай». Беларусь атрымала пункт 3В — краіна, дзе паліятыўная дапамога атрымала шырокае распаўсюджанне. Зусім няшмат, каб дагнаць перадавыя дзяржавы, якія вызначаюць правілы гульні.

***— А што для гэтага трэба?***

— Ядро ў нас створана, неабходна развівацца. Для гэтага перш за ўсё, як і ў любой справе, важна мець прафесійныя кадры. Тут ёсць пэўныя цяжкасці, паколькі адпаведных спецыялістаў у Беларусі не рыхтуюць. Цяпер прапрацоўваецца пытанне аб стварэнні на базе нашай краіны міжнароднага адукацыйнага цэнтра па паліятыўнай медыцыне. Мяркуецца, што выкладаць да нас будуць прыязджаць вядучыя сусветныя спецыялісты ў гэтай галіне. Зараз рыхтуецца адпаведная праграма, якая ўжо ў верасні будзе абмяркоўвацца.

У плане актыўнага развіцця паліятыўнай медыцынскай дапамогі важная больш дакладная і эфектыўная каардынацыя дзейнасці паміж рознымі ведамствамі, паколькі гэта задача не толькі для сферы аховы здароўя. Гэта комплексная задача, у тым ліку і для сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва. Важна забяспечыць больш актыўны ўдзел грамадскіх арганізацый — тут, на мой погляд, вялікі патэнцыял і шмат нерэалізаваных дасюль магчымасцяў. Калі ўсё гэта запрацуе належным чынам, то і вынік не прымусіць сябе чакаць. Галоўнае — дапамога хворым людзям стане больш даступнай, палепшыцца якасць іх жыцця.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
*litvinov@zviazda.by*

**Дарэчы**

Паліятыўная медыцынская дапамога — від аказання медыцынскай дапамогі пры наяўнасці ў пацыента невылечных захворванняў, якія абмяжоўваюць працягласць жыцця, патрабуюць прымянення метадаў аказання медыцынскай дапамогі, накіраваных на пазбаўленне ад болю і палягчэнне іншых праяў захворванняў, калі магчымасці іншых метадаў аказання медыцынскай дапамогі вычарпаны, у мэтах паляпшэння якасці жыцця пацыента.

**З Закона «Аб ахове здароўя»**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 ЛІПЕНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 13 (15797)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Вольга ГРЫБОЎСКАЯ:

# «Галоўнае, каб цанілі не толькі за знешнасць»



**Сярод прэтэндэнтак на сёлетнюю карону «Міс Беларусь — 2016» яна была адзінай з Брэста. Хоць запаветны тытул і дастаўся іншай, аднак наша гераіня мела шанц памножыць свой багаж вопыту ў сферы прыгажосці, які ў яе з'явіўся падчас працы фотамадэллю ў Парыжы, а таксама калі прадстаўляла нашу краіну на міжнародным спаборніцтве прыгажунь «Miss Tourism Queen of the Year International 2015». Як канкурсантка ставіцца да подыума і работы пад сафітамі, што думае пра жаночую прыгажосць і якім бачыць уласнае заўтра, мы даведаліся з размовы з Вольгай Грыбоўскай.**

***— У якой атмасферы праходзіла падрыхтоўка да «Міс Беларусь»? Якія ўспаміны ў вас застануцца ад гэтага перыяду вашага жыцця?***

— Успомніць дакладна ёсць што. На тых жа рэпетыцыях, якія цяпер прыгадваю з усмешкай, было складана, а зараз здаецца, быццам усё было проста. Здымачная група тэлеканала АНТ — гэта асаблівыя людзі, заўсёды на пазітыве. Яны засталіся па-за кадрам, аднак менавіта дзякуючы іх працы ўсе мы сталі ўдзельнікамі і ўбачылі незабыўнае шоу. І, безумоўна, я ніколі не забуду чароўных дзяўчат, з кім мы былі побач на працягу ўсяга праекта. Веру, што мы абавязкова аднойчы яшчэ сустрэнемся. Я не лічу, быццам адны з нас выйгралі, а іншыя засталіся ў пройгрышы. Бо два варыянты жыцця пасля конкурсу — надта малы выбар. Усе з нас заслугоўваюць перамогі, і той факт, што мы дайшлі да фіналу, пацвярджае гэта. Карона дасталася толькі адной, а астатнія засталіся ў выніку са сваімі прызамі, проста для кагосьці ім стаў карысны вопыт, а для некага — з'яўленне новых добрых сяброў...

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Парады бывалых

# АБІТУРЫЕНТАМ-2017,

## або 10 сакрэтаў паспяховай здачы ЦТ

**Вось і скончыліся самыя страшныя выпрабаванні для выпускнікоў 2016 года. Усе вынікі цэнтралізаванага тэсціравання ўжо вядомыя. Хтосьці засмучаны, а хтосьці, наадварот, бязмерна шчаслівы. Сярод апошніх і мая найлепшая сяброўка, выпускніца СШ №14 г. Мазыра Наталля МІШЧАНКА, якая набрала 399 балаў з чатырохсот магчымых.**



Факультэт міжнародных адносін БДУ, які абрала Наташа, адзін з самых прэстыжных у Беларусі. Конкурс і прахадныя балы там фантастычныя, таму сур'ёзную падрыхтоўку яна распачала яшчэ ў 10 класе. Здаваць трэба было тры прадметы: рускую і англійскую мовы і грамадазнаўства. Першую — заўсёды вучыла сама, а з англійскай мовай і грамадазнаўствам дапамагалі рэпетытары. Але ўсё ж аддаць належнае варта і самастойнай падрыхтоўцы. Скончыла школу з залатым медалём і з усімі дзясяткамі ў атэстаце. На абласной алімпіядзе па рускай мове ў 11 класе ўзяла першы дыплом і аўтаматам атрымала 100 балаў на ўступных іспытах па гэтай дысцыпліне. Грамадазнаўства здала на 100 балаў і англійскую мову — на 99.

Наталля з задавальненнем пагадзілася падзяліцца сваімі сакрэтамі падрыхтоўкі з абітурыентамі наступнага года.

### 1. Задацца мэтай

У першую чаргу, трэба дакладна вырашыць, чаго вам больш хочацца: паступіць у ВНУ або прайсці яшчэ адзін узровень камп'ютарнай гульні. Каб атрымаць максімум балаў, трэба прыкласці і максімум намаганняў ды ўсвядоміць, што ніхто не зробіць гэтага за вас. У заданнях няма нічога звышнатуральнага і непад'ёмнага, але толькі не для гультаёў.

### 2. Скласці штодзённы план і прытрымлівацца яго

У эфектыўнай падрыхтоўцы і рацыянальнай арганізацыі часу мне вельмі дапамагло складанне плана свайго навучання. Некалькі заданняў у дзень па кожным з трох прадметаў — не такая ўжо і складаная праца. Асабліва ў параўнанні з бяссоннымі начамі і спробамі ахапіць усё і адразу за некалькі тыдняў да ЦТ. Ад гэтага нават задавальненне атрымліваеш, калі закрэсліваеш чарговую выкананую справу ў сваім спісе.

### 3. Вучыць услых

Чытаем і прамаўляем усё услых. Такім чынам працуе не толькі зрокавая, але і гукавая памяць, дзякуючы чаму ўсё лепш і хутчэй запамінаецца.

### 4. Больш практыкі

Не забываем пра важнасць практыкі. Штодня рашаем заданні з тэстаў мінулых гадоў. Якімі б глыбокімі ведамі вы ні валодалі, іх яшчэ трэба ўмець прымяняць, а таксама трэба мець уяўленні пра структуру тэста. Я таксама параіла б набыць зборнік і пачаць яго рашаць па варыянце ў дзень за 10 дзён да ЦТ. Так сапраўдны экзамен стане для вас проста чарговым тэстам.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Важацкі хлеб

# Хто «Ракеце» надае «Імпульс»,

## ці Калі справа не толькі ў заробку

**У трэцім працоўным семестры традыцыйна бяруць актыўны ўдзел будучыя настаўнікі. Толькі ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка сёлета было створана 24 студэнцкія атрады (17 педагагічных, 5 валанцёрскіх і 2 сервісныя), у склад якіх увайшло каля тысячы хлопцаў і дзяўчат. Большасць працуе ў дзіцячых летніках Мінскай вобласці. Для многіх са студэнтаў работа ў лагеры — абавязак, бо яна залічваецца ў якасці педагагічнай практыкі. Але ёсць і выключэнні. Напрыклад, педатрад «Імпульс», у якім працуюць студэнты факультэта псіхалогіі БДПУ. Трапіць у яго не так проста — яшчэ за паўгода пачынаецца сур'ёзны адбор і да фінішу даходзяць далёка не ўсе. Мы даведаліся, што прымушае маладых людзей прайсці «агонь і ваду», каб паспытаць «важацкага хлеба».**

— У складзе нашага атрада працуюць студэнты другога-чацвёртага курсаў, — расказвае **выкладчык кафедры сацыяльнай і сямейнай псіхалогіі факультэта псіхалогіі БДПУ, кіраўнік атрада «Імпульс» Вольга МУКАВОЗЧЫК**. — Галоўнае, што іх вылучае — высокая матывацыя: усе яны вельмі хочуць працаваць з дзецьмі і самаўдасканальвацца. Адбор кандыдатаў у атрад мы распачалі яшчэ ў лютым: студэнты рыхтавалі матывацыйнае эсэ, пісалі план мерапрыемстваў на кожны дзень, удзельнічалі ў трэнінгах па камунікацыі і рабоце ў камандзе.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*



Для моцнай паловы атрада самае цяжкае — работа з маленькімі дзецьмі.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
21 07 2016 г.

# АБІТУРЫЕНТАМ-2017

### 5. Галоўнае — увага да дробязяў

Калі вы хочаце набраць 100 балаў, то заўважаем і вучым усе без выключэння дробязі. Таму што калі вы не звернеце ўвагу на нейкае пытанне, правіла ці слова, то за вас гэта зробяць складальнікі заданняў.



### 6. Выконваць работу над памылкамі

Яны — вашы слабыя месцы. Яны патрабуюць асаблівай увагі. Дапусцілі памылку ў тэксце — выпісалі, знайшлі на яе правіла, вывучылі яго і яшчэ некалькі разоў выканалі падобныя заданні.

### 7. Памятаць пра астатнія прадметы і школьныя іспыты

Не забывайцеся пра тое, што чвэрць вашых балаў пры паступленні забяспечвае атэстат. Пажадана падумаць пра гэта ў пачатку года і імкнуцца зарабляць добрыя балы з першай чвэрці, таму што ў апошняй вам ужо будзе не да гэтага.

### 8. Выкарыстоўваць кожную вольную хвілінку

Калі ў вас мала вольнага часу і вы баіцеся не паспець нешта выканаць, насіце заданні заўсёды з сабой: на ўрокі, рэпетыцыі, бярыце ў паездкі. Выдалася вольная хвілінка? Рашайце тэсты, а ўжо дома разбірайце памылкі. Такім чынам вы сэканоміце шмат часу і зможаце ўвечары даўжэй прагуляцца.

### 9. Не перагружаць сябе

Не варта сябе нагружаць да знясілення. Змена дзейнасці і абстаноўкі толькі дапаможа вам з новымі сіламі ўзяцца за вучобу. Не забывайцеся выходзіць на вуліцу, кантактаваць з сябрамі, чытаць кнігі. Проста займайцеся ў меру наўмысна, бо нават кароткі адпачынак у навучальным годзе дастаткова.

### 10. Не забывацца пра метад выключэння

Максімум засяроджанасці і ніякіх старонніх думак у самой аўдыторыі. А для таго, каб лішні раз не памыліцца, можна на чарнавіку спачатку закрэсліваць дакладна няправільныя адказы, звужаючы круг, ну а затым абводзіць правільны.

**Вікторыя КУПРАЦЭВІЧ,**
**выпускніца СШ №14 г.Мазыра.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

*Сеціва ў дапамогу*

# Нетрадыцыйная зброя,

## або Інавацыі супраць падлеткавых праблем




**Цэнтр інавацый і партнёрства пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі адкрыўся ў Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».**

Традыцыйна лічыцца, што вырашаць праблемы непаўналетніх павінны дарослыя. Але што будзе, калі дазволіць дзецям самім знаходзіць выйсце са складаных сітуацый? Гэтай думкай і кіраваліся стваральнікі Цэнтра інавацый і партнёрства. Як падкрэсліў прадстаўнік ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь доктар Рашэд Мустафа Сарвар, у сучасным свеце нельга ўявіць жыццё без інавацый, а дзеці найбольш чуйна ўлоўліваюць новыя павевы. Аб'яднаўшы дзяцей за адной агульнай справай, можна атрымаць ад такога партнёрства максімальны эфект. Дзеці самі будуць фарміраваць пералік сацыяльна значных праблем, якія іх хваляюць, і вучыцца іх вырашаць, прычым самастойна.

Пачалі з таго, што ляжыць на паверхні: засілле сучасных тэхналогій, якое ўтойвае ў сабе мноства пагроз, у прыватнасці, кібербулінг або інтэрнэт-траўлю. Пераследаваць адчувальных да кпінаў падлеткаў могуць як аднакласнікі, так і абсалютна незнаёмыя людзі. Ад кардынальных мер барацьбы прасунутая моладзь адмовілася адразу: ну хіба можна назваць жыццё без інтэрнэту паўнавартасным? Выйсце — уставаць на сцежку вайны, але з нетрадыцыйнай зброяй. На ўсе нападкі трэба адказваць... творчасцю.

«Усё роўна, што гэта будзе: коміксы, трукі на скейце або вершы-пражкі (чатырохрадкоўі з нечаканым фіналам), любая творчасць — гэта выдатны спосаб перастаць канцэнтравацца на негатыве», — сур'ёзна разважаюць хлопцы і дзяўчаты. Можна выкарыстоўваць самаіронію: калі вы будзеце жартаваць з сваіх недахопаў самі, у «праследавацеляў» аўтаматычна адпадуць падставы для здзекаў. «Заўсёды можна завесці новы акаўнт» — «Ага, яшчэ скажы — пераехаць», — з'яўляюцца ўсё новыя ідэі і нагоды для бурных абмеркаванняў. — «Трэба самім быць больш добрымі. На кожны злосны каментарый адказваць пазітыўным, старацца перамяніць адносіны да сябе». Увогуле, як казалі ў адным вядомым мульціку: «Давайце жыць дружна».

Спецыялісты сыходзяцца ў меркаванні, што адзіны спосаб барацьбы з тролямі — гэта іх поўнае ігнараванне. Па магчымасці трэба пазбягаць нават чытання іх поўных жоўці пасланняў, месца якім у смецевым кошыку. Акрамя таго, абавязкова неабходна звяртацца ў тэхпадтрымку сайта з просьбай заблакаваць агрэсіўнага карыстальніка.

**Спецыялісты сыходзяцца ў меркаванні, што адзіны спосаб барацьбы з тролямі — гэта іх поўнае ігнараванне. Па магчымасці трэба пазбягаць нават чытання іх поўных жоўці пасланняў.**

У той час, калі адны хлопцы і дзяўчаты шукаюць спосабы, як пазбавіцца ад непатрэбнай увагі да іх персоны ў інтэрнэце, іншыя, наадварот, вучацца ўсеагульную ўвагу прыцягваць: у межах дзейнасці Цэнтра інавацый і партнёрства свой праект прадставіла школа юных відэаблогераў пад жыццесцвярджальнай назвай «Allteenscan!» («Усе падлеткі могуць!»). «Наша задача — навучыць дзяцей здымаць якасныя ролікі, якія будуць прыносіць карысць іншым», — тлумачыць шэптам канцэпцыю кіраўнік праекта, намеснік старшыні Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» Віталь Нікановіч. Шэптам, каб не перашкаджаць падлеткам, якія засяроджана выконваюць заданне — размясціць толькі што зробленае групавое фота ў сацыяльных сетках. Але размясціць не бяздумна, а па ўсіх правілах: з дакладнай геалакацыяй, падрабязнымі хэштэгамі і нетрывіяльным подпісам. А для фота яшчэ трэба знайсці добры ракурс, злавіць святло, выбраць маштаб, а калі гэта не фота, а відэа... Вось так, здавалася б, звыклыя рэчы, ператвараюцца ў сапраўдную навуку. Нездарма поўны курс навучання разлічана на некалькі месяцаў.

«Allteenscan!» (дарэчы, варта глянуць іх канал на YouTube) заяўлены як міжнародны праект для рускамоўнай аўдыторыі, у рамках якога падлеткі могуць дзяліцца цікавай і карыснай для іншых інфармацыяй. Асаблівая ўвага ўдзяляецца глабальным пытанням і праблемам: паляпшэнню ўмоў жыцця людзей з абмежаванымі магчымасцямі, прадухіленню распаўсюджвання ВІЧ і СНІДу, барацьбе са шкоднымі звычкамі, пошуку свайго месца ў свеце.

«Кожная з нас хацела б весці свой блог. Вельмі любім глядзець такія ролікі», — дзеляцца планамі чатырнаццацігадовыя дзяўчаты. Але пытанне пра тэму сюжэтаў ставіць іх у тупік: «Проста пра жыццё. Што я рабіла, дзе была, каго бачыла, што смешнае прыдумала і шмат іншага! Няўжо гэта нецікава?» Адна з дзяўчынак нясмела спрабуе запярэчыць, што хацела б закрануць больш сур'ёзныя тэмы, напрыклад, расказаць пра сваю невідушчую знаёмую. «Яшчэ можна здымаць блог пра моду!», «Ці стаць фудхантарам»— не звяртаючы на яе ўвагу, працягваюць больш бойкія сяброўкі. Што тут дадаць, акрамя таго, што — «Allteenscan!»

**Дар'я КАСКО.**



*Разумнікі і разумніцы*

# У скарбонцы — россып узнагарод

**Выпускнік Шчучынскай гімназіі Андрэй Асанаў заваяваў серабро 57-й міжнароднай матэматычнай алімпіяды ў Ганконгу.**

У гэтым годзе ў ёй удзельнічалі зборныя 109 краін (па 6 прадстаўнікоў у камандах). Зборная Беларусі прывезла з інтэлектуальных спаборніцтваў таксама чатыры бронзавыя медалі, адзін пахвальны водгук і заняла 57-е месца ў рэйтынгу краін. З «бронзай» вярнуліся дадому Ягор Дубовік (гімназія №51 г. Гомеля), Ілья Пчалінцаў, Аляксандр Юран (абодва — выхаванцы Ліцэя БДУ) і Барыс Серанкоў (гімназія №41 г.Мінска). Дарэчы, Андрэй Асанаў ужо падаў дакументы ў Белдзяржуніверсітэт на спецыяльнасць «прыкладная матэматыка», дзе яму гарантавана пазаконкурснае залічэнне.

Вельмі паспяховым стала і выступленне беларускіх школьнікаў на 47-й Міжнароднай фізічнай алімпіядзе ў Цюрыху (Швейцарыя). Спаборніцтвы ўключалі два туры: цягам пяці гадзін удзельнікі выконвалі эксперыментальныя работы на сучасным абсталяванні, а потым вырашалі тэарэтычныя задачы, прапанаваныя арганізатарамі. У выніку прадстаўнікі беларускай школы заваявалі чатыры ўзнагароды рознай вартасці: «золата» — Эрык Камлык (Гродзенская гарадская гімназія), «серабро» — Ян Лагоўскі (выпускнік Ліцэя БДУ), «бронзу» — Павел Цай (гімназія №29 г. Мінска) і Віталь Вістуноў (СШ №16 г. Полацка).

У VIII міжнародным турніры юных матэматыкаў у Санкт-Пецярбургу ўдзельнічалі дзве беларускія каманды. Ва ўпартай барацьбе з традыцыйна моцнымі сапернікамі з Францыі, Германіі, Балгарыі, Румыніі і Расіі яны заваявалі «серабро» і «бронзу».

З «бронзай» вярнуліся нашы школьнікі і з Міжнароднага турніру юных фізікаў, які прайшоў у Екацярынбургу. Каманда Беларусі змагалася сярод 29 каманд з Еўропы, Азіі, Аўстраліі, Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі. Турнір складаецца з некалькіх паслядоўных баёў. Каманды на англійскай мове прэзентуюць свае даследаванні па прапанаваных заданнях, а таксама выступаюць у ролі апанентаў і рэцэнзентаў для іншых удзельнікаў. Каб трапіць на п'едэстал, нашым школьнікам давялося прадэманстраваць не толькі глыбокія веды па фізіцы, але і навыкі публічнага выступлення і здольнасці да хуткага і глыбокага аналізу чужога рашэння задачы.

*Ведай нашых!*

# Увайшлі ў... стратасферу

**Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запусцілі спадарожнік на V чэмпіянаце «CanSat у Расіі».**

У склад каманды ўвайшлі другакурснік і трэцякурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій (ФРКТ) БДУ Іван Саечнікаў і Мікіта Мішчанка, а таксама студэнт 3 курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Уладзіслаў Паўловіч. Маладыя канструктары запусцілі спадарожнік масай да аднаго кілаграма на стратасферным шары на вышыню да 30 кіламетраў. Адзіная фінальная пуцёўка была заваявана студэнтамі БДУ на адборачнай сесіі чэмпіянату дзякуючы бліскучай абароне сёлета ў лютым свайго навуковага праекта. Тады хлопцы сталі першымі і набралі з усіх удзельнікаў максімальную колькасць балаў — 98. Падрыхтоўкай студэнтаў займаўся аспірант ФРКТ БДУ Антон Саечнікаў.

Таксама паспяховым стала выступленне ў фінале чэмпіянату ліцэістаў БДУ Алега Сафонава і Анастасіі Патачыц. Яны сталі бронзавымі прызёрамі спаборніцтваў у сваёй узроставай катэгорыі. Іх спадарожнік быў запушчаны на ракеце на вышыню аднаго кіламетра.

Усяго ў адборачнай сесіі чэмпіянату «CanSat у Расіі» прынялі ўдзел каля 200 школьнікаў і студэнтаў. Арганізатарам апошняга ў Расіі выступае Навукова-даследчы інстытут ядзернай фізікі МДУ. Чэмпіянат складаецца з некалькіх конкурсаў, якія адрозніваюцца зместам і ўзроўнем падрыхтоўкі ўдзельнікаў: вышэйшая ліга, студэнцкая ліга і г.д. Мэта праекта — прыцягнуць увагу школьнікаў і студэнтаў да навукаёмістых і высокатэхналагічных галін, у прыватнасці, да касмічных даследаванняў і інфармацыйных тэхналогій. Першы конкурс «CanSat» адбыўся ў 1999 годзе ў ЗША. Спаборніцтвы вельмі папулярныя таксама ў Еўропе і Японіі.

*Мы — памятаем!*

# Вахта пошукавікаў не спыняецца

**Рэспубліканскі злёт пошукавых атрадаў (клубаў) «Мы — нашчадкі Перамогі» праходзіць гэтымі днямі на базе Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства. Яго арганізатарамі выступілі міністэрствы адукацыі і абароны нашай краіны.**

Удзельнікамі рэспубліканскага злёту сталі 80 вучняў, якія наведваюць аб'яднанні па інтарэсах ваенна-патрыятычнай накіраванасці, актывісты пошукавага руху, члены саветаў музеяў баявой славы ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама прадстаўнікі пошукавых атрадаў Расійскай Федэрацыі. У праграме злёту — конкурс «Візітоўка каманды», конкурс на лепшую атрыбутыку пошукавага руху, панэльная дыскусія «Мы — нашчадкі Перамогі», правядзенне навучальных трэнінгаў і майстар-класаў «Тэорыя пошукавай работы», вечар патрыятычнай тэматыкі «Паклонімся вялікім тым гадам», вечар памяці «Перамогу — шануем, герояў — помнім» (сустрэча з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны), акцыя «Дарога да абеліска» па добраўпарадкаванні памятных месцаў ваеннай гісторыі. Таксама для навучэнцаў будуць праведзены экскурсійна-адукацыйныя праграмы: «Памяць, якой не будзе забыцця», «Даведнік у свет прафесій», «Выхоўваем патрыётаў», «Мінск — горад-герой». Не абышлі ўвагай арганізатары таксама спартыўны блок і культурна-забаўляльную праграму.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Хрышчэнне тэатрам*

# Шляхам ад «Студыёзаў» да віртуозаў

**Адкуль пачынаецца творчы шлях акцёра тэатра? Вядома ж, са студэнцкіх спектакляў. Сёння мы вырашылі пагаварыць з рэжысёрам Тэатральнай майстэрні «Студыёзы» Вячаславам Сашчэкам. Ён ужо 12 гадоў працуе выкладчыкам кафедры тэатральнай творчасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. «Студыёзы» — гэта творчае аб'яднанне, дзе спалучаюць традыцыйныя і сучасныя тэатральныя формы і эксперыментуюць, нестандартна глядзяць на вядомыя творы. Майстэрня імкнецца да сучаснага інтэлектуальнага тэатра, дзе можна жартаваць, рызыкаваць, уключаць у гульню гледача.**



— Аб'яднанне было створана ў 2008 годзе. Назву абралі з некалькіх прычын. Па-першае, студыёзы — гэта студэнты, што для майстэрні вельмі важна, бо гэта тэатр маладых. Менавіта студыйны пошук, эксперымент і навучанне — аснова нашай творчай дзейнасці. Па-другое, назва выказвае мэту — імкненне да віртуознай сцэнічнай гульні. Наша звышзадача — дамагчыся таго, каб «Студыёзы» асацыяваліся з віртуозамі. Нядаўна даведаўся, што ўжыванне слова «студыёзы» ў тэатральным кантэксце мае вялікую гісторыю: яшчэ ў пачатку XX стагоддзя знакаміты рускі тэатральны рэжысёр Усевалад Меерхольд называў сваіх вучняў-тэатралаў «студыёты».

**«Мы стараемся зрабіць нашы спектаклі відовішчнымі і выразнымі. Але гэта не значыць, што наша галоўная мэта — забава. Усё ж наш глядач у першую чаргу — гэта інтэлігентны чалавек».**

У 2009 годзе мы паставілі першы студыйны спектакль па матывах карыкатур Херлуфа Бідструпа. П'еса да гэтага часу захавалася ў рэпертуары майстэрні.

***— На каго ці на што вы арыентуецеся ў рабоце?***

— Калі казаць пра майстэрню, то яе праца будуецца на традыцыях ансамблевага псіхалагічнага тэатра і яго апалагетаў — Канстанціна Станіслаўскага, Міхаіла Чэхава, Георгія Таўстаногава. Шмат чаго запазычана з пецярбургскай тэатральнай спадчыны. Мой настаўнік — Дзіна Георгіеўна Тыцюк — выдатны педагог пецярбургскай тэатральнай школы. Можна сказаць, што ад яе я і атрымаў «хрышчэнне тэатрам». Да гэтага часу для мяне асноўнымі арыенцірамі з'яўляюцца яе майстэрства, культура, стаўленне да прафесіі.

***— Як выбіраеце рэпертуар?***

— Часта ён нараджаецца спантанна. Першапачаткова я сыходжу з творчай прыроды вучняў: якія яны, што ім цікава, які ў іх светапогляд, што ў іх трэба развіваць. Другое, што важна пры выбары матэрыялу для пастаноўкі, — гэта сучасны свет, і тое, што ў ім адбываецца. Год таму мы вырашылі паставіць выдатную п'есу «Дзве стралы» Аляксандра Валодзіна. Закранутыя ў ёй праблемы абсалютна сугучныя нашаму часу, калі-нікалі нават узнікае адчуванне, што яна напісана сёння, а не ў сярэдзіне XX стагоддзя. Атрымаўся вельмі жывы і актуальны спектакль.

***— Галоўная задача майстэрні...***

— ...абудзіць творчую прыроду студэнтаў. Вельмі трывожыць абыякавасць, якая часта сустракаецца ў пачаткоўцаў. Абыякавасць да свету, да прафесіі. Мне б хацелася справакаваць вучняў на тое, каб яны захацелі змяніць сябе і навакольны свет. Гэта тычыцца не толькі ўдзельнікаў майстэрні, але і гледачоў.

***— Якія цяжкасці ўзнікаюць пры пастаноўцы спектакляў?***

— У першую чаргу — матэрыяльныя. Няпроста прыдумаць афармленне спектакля так, каб было, з аднаго боку, выразна і арыгінальна, а з іншага — танна. Часам даводзіцца выкручвацца. Аднойчы нам для спектакля спатрэбіўся грамафон. Ні ў каго знайсці яго не ўдалося, купляць было дорага. У выніку мы зладзілі музычны інструмент з трубы, грамафоннай асновы і звычайнай мясарубкі. Калі казаць пра нематэрыяльныя цяжкасці, то асноўная — падвядзенне студэнтаў да гульнявога разумення матэрыялу, а таксама падаграванне іх цікавасці, калі спектакль ужо пастаўлены.

***— Што з творчага складніка запомнілася найбольш?***

— Мне спадабалася працаваць над паэмай Марыны Цвятаевай «Пацукалоў». Гэты спектакль зараз у рэпертуары майстэрні «Студыёзы». Неверагодна складаны і глыбокі па змесце матэрыял. Да гэтага часу адкрываюцца новыя сэнсы і падтэксты. Я назваў бы гэты спектакль «артхаусным». Вельмі складаная паэтычная мова Цвятаевай, філасофская глыбіня паэмы — сур'ёзны выклік для рэжысёра і акцёраў.

***— Дзе звычайна праходзяць вашы выступленні?***

— Часцей за ўсё ў вучэбным тэатры ВНУ. Праўда, гэта памяшканне занята. Таму цяпер нам няма дзе паказваць нашы спектаклі. Нядаўна мы паказвалі «Дзве стралы» на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Думаем працягваць падобную практыку.

***— Даводзілася гастраляваць?***

— Мне запомнілася паездка ў Санкт-Пецярбург з перформансам «Жывыя карціны» і спектаклем «Павятовы горад N». Гэта было своеасаблівым баявым хрышчэннем «Студыёзаў». Многія ўпершыню пабывалі ў культурнай сталіцы Расіі, былі і тыя, хто наогул першы раз выехаў за межы нашай краіны. Акрамя таго, мы бралі ўдзел у тэатральных фестывалях у Літве, Беларусі і Расіі.

***— Хто ваш глядач?***

— Мы стараемся зрабіць нашы спектаклі відовішчнымі і выразнымі. Але гэта не значыць, што наша галоўная мэта — забава. Усё ж наш глядач у першую чаргу — гэта інтэлігентны чалавек. Тут няма ўзроставых абмежаванняў. Удзячнымі гледачамі былі як дзеці 12 гадоў, так і зусім дарослыя людзі. Па стылі спектаклі неадназначныя, яны могуць зацікавіць людзей самых розных поглядаў.

Многія падыходзяць і дзякуюць пасля спектакля, часта водгукі пакідаюць у інтэрнэце. Для нас вельмі важная ўзаемасувязь з нашымі гледачамі. Таму нядаўна мы вырашылі пасля спектакляў праводзіць адкрытае абмеркаванне. Гутарка праходзіць у вольнай форме, ахвотныя выказваюць свае думкі. Многія хваляць, але бываюць і заўвагі. Гэта вельмі важна — ведаць, як глядач успрыняў пастаноўку, што зразумеў, а што не.

***— Якой вы бачыце будучыню майстэрні?***

— У найбліжэйшых планах — набраць у майстэрню новае таленавітае пакаленне тэатралаў. Якраз гэтым летам у рамках прыёмнай кампаніі ва ўніверсітэце культуры будзе праходзіць чарговы набор студэнтаў у майстэрню «Студыёзы».

У глабальных планах — захаваць майстэрню і вывесці яе на новы творчы ўзровень. Кожныя чатыры гады асноўны склад трупы абнаўляецца. Хацелася б сабраць пад адным дахам і выпускнікоў, каб яны не разляталіся па розных кутках краіны. Каб тыя, хто прайшоў вучэбныя «агонь, ваду і медныя трубы», сталі асноўным ядром майстэрні. І тады можна было б сказаць, што з'явіўся новы маладзёжны тэатр.

**Дар'я ЦАУНЯ, Марыя ДАРАШКЕВІЧ, студэнткі II курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Моцныя духам*

# НІКОЛІ НЕ ЗДАВАЦЦА!

**Гэта здарылася два гады таму. Быў канец жніўня, і я з сябрамі праводзіла апошнія дні лета, атрымліваючы асалоду ад канікулаў і цёплага сонца. Тады нам так падабалася залазіць на дрэвы, праводзіць там фотасесіі і гадзінамі абмяркоўваць усё, што было для нас цікавым. Мы не задумваліся аб небяспецы, здавалася, весялосць ніколі не скончыцца. І вось адбыўся няшчасны выпадак. Мая сяброўка Каця Сычова сарвалася з галінкі, на якой сядзела, і ўпала спінай на зямлю...**

Спалохаўшыся, мы злезлі з дрэва і падбеглі да дзяўчыны. Пыталіся, як яна сябе адчувае, ці можа ўстаць. Каця паскардзілася на боль у спіне і боку. На наступны дзень мы даведаліся, што ў маёй сяброўкі зламаныя чатыры пазванкі... Каці быў прызначаны пасцельны рэжым на паўгода. Для цыркуляцыі крыві ёй было рэкамендавана рабіць лёгкія практыкаванні для рук і ног, лежачы ў ложку. Усе блізкія хваляваліся за яе здароўе. А сама Каця вельмі перажывала, што больш не зможа весці актыўны лад жыцця, бо яна займалася спартыўнымі бальнымі танцамі і музыкай, вельмі любіла катацца на каньках. Яна не магла ўявіць сабе сваё жыццё без усяго гэтага і старалася не здавацца, робячы ўсё магчымае, каб хутчэй стаць на ногі.

Паколькі сяброўка не магла наведваць школу, да яе кожны дзень прыходзілі настаўнікі і займаліся з ёй па вучэбнай праграме. Яны падтрымлівалі Кацю, расказвалі нам, якая яна малайчына! Бо вельмі цяжка вучыцца, калі ты заўсёды ляжыш і працуеш толькі рукамі. А яна старалася пісаць, чытаць падручнікі і вучыць школьны матэрыял. Мы з аднакласнікамі, вядома ж, таксама не забывалі пра яе: пасля ўрокаў наведвалі, дзяліліся цікавымі навінамі са школьнага жыцця, прыносілі пачастункі. Я бачыла, як рада яна нам, і не пераставала здзіўляцца жыццярадаснай пазіцыі і ўпартасці сяброўкі.

...З ложка яна змагла падняцца раней, чым праз шэсць месяцаў. Каця расказвала, што не зусім верыла ў сябе, але вельмі хацела хутчэй стаць на ногі і вырашыла змагацца да апошняга. І вось дзяўчыне ўжо можна наведваць школу.

Мы з радасцю сустрэлі Кацю пасля доўгага выздараўлення, кінуўшыся да яе насустрач. Каця ўся ззяла і дзякавала нам у адказ. Наша падтрымка ў цяжкую хвіліну дапамагла ёй у барацьбе з хваробай. Напачатку аднакласніца не магла займацца сваімі любімымі танцамі. Аднак мая сяброўка не журылася і не падала духам, а прымала ўдзел у творчых мерапрыемствах і фестывалях, дзе паказвала ўсё, на што яна здатная. Кацюша такі чалавек, які імкнецца да сваёй мэты і дамагаецца таго, чаго хоча.

Яна вялікая малайчына, бо сёння зноў займаецца сваёй любімай справай — танцамі! Гледзячы на яе, я разумею, як важна быць моцным і цярплівым чалавекам. Мая сяброўка дала мне прыклад веры ў сваю мару. І калі мне раптам захочацца ўсё кінуць і з усім змірыцца, я заўсёды буду ўспамінаць Кацю.

**Ганна КУРТАСАВА, выпускніца 11 класа ліцэя №2 г. Мінска.**




# ПРАЗ ІНШУЮ ПРЫЗМУ

**Перагледзеўшы некалькі апошніх матэрыялаў з рубрыкі, заўважыў, што неяк шмат негатыву давялося выказаць у бок інтэрнэту і ўсяго, што з ім звязана. Нават адчуў сябе вінаватым — сам як-ніяк дзіця інфармацыйнай эпохі. Таму варта рэабілітавацца. Ды і нагодаў дзеля гэтага апошнім часам хапае. Вось, скажам, ці чулі вы пра «прызму»? Вядома, не тую, што дэманструюць у школе на ўроках фізікі, калі тлумачаць законы оптыкі. Я пра праграму Prisma, што зрабіла каманда распрацоўшчыкаў з Расіі і якая ўразіла карыстальнікаў, мабыць, не менш, чым беларускі MSQRD.**

Яе магчымасці за лічаныя дні ўзнеслі праграму ва ўсе магчымыя топы, хоць функцыянал яна мае не самы шырокі. Гэта фотарэдактар, якіх сотні ў любой краме дадаткаў. Карыстальнік праграмы выбірае на сваім смартфоне любое фота (звычайна выбар падае на ўласныя здымкі і «сэлфі»), якое пасля дасылаецца на спецыяльны сервер. Там з выявай працуе так званая нейрасетка — спецыяльны алгарытм, які функцыянуе па прынцыпах чалавечага мозга, здольны да саманавучання і ў пэўнай ступені нават «творчасці». На выхадзе карыстальнік атрымлівае фота, стылізаванае пад карціны сусветна вядомых мастакоў: Ван Гога, Шагала, Малевіча, Далі, Мунка, Манэ і многіх-многіх іншых (можна выбіраць з дзясяткаў такіх «эфектаў»). Фактычна, Prisma пераўтварае фота ў карціну, хай сабе і электронную.

За некалькі тыдняў стужкі сацыяльных сетак запоўніліся тысячамі здымкаў, на якіх кожны вылучаўся, як мог. Нехта нават абхопліваў галаву рукамі і станавіўся на мост, каб паўтарыць кампазіцыю славутага «Крыку» Мунка, нехта шукаў падобныя на «Зорную ноч» Ван Гога пейзажы... Prisma прымусіла нават тых, хто ніколі не цікавіўся выяўленчым мастацтвам, успомніць даўно забытыя са школьнай праграмы па айчыннай і сусветнай мастацкай культуры імёны. Дзіўна было бачыць у стужках фота дзяўчат, якія раней выкладвалі ў лепшым выпадку дзясяткі сэлфі, здымкі сваіх хатніх жывёл і забаў на выхадных. Бясспрэчна, праграма наўрад ці можа зрабіць вас больш адукаванымі, але разбудзіць цікаўнасць да сапраўднага мастацтва — цалкам верагодна.

Увогуле, сеціва апошнім часам прыемна ўражвае. Асабліва гэта датычыцца сацыяльных сетак. Здаецца, ужо прайшоў час цікаўнасці масавай аўдыторыі да паблікаў са смешнымі карцінкамі, «барадатымі» жартамі, рэцэптамі і парадамі, як стаць паспяховым. З'явіліся суполкі вельмі вузкай і незвычайнай спецыялізацыі. Мне, як аматару гісторыі, падабаецца сачыць за адной з такіх, дзе выкладваюць рознага кшталту матэрыялы пра эпоху позняга СССР і першую палову 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Некаторыя рэчы, якія сустракаюцца там, цяжка знайсці яшчэ дзе-небудзь. Вось днямі выклалі відэа аднаго з выпускаў перадачы «Рок-архіў», якую стварылі амаль 25 гадоў таму на беларускім тэлебачанні. Ну дзе яшчэ такое знойдзеш? Зазначу, што суполка далёка не маргінальная і вузкаспецыялізаваная — у яе больш за 50 тысяч падпісчыкаў. Дызайн, мастацтва, тэхналогіі — што б вас ні цікавіла, абавязкова знойдзецца паблік, які адкрые нямала новага.

А як інтэрнэт вярнуў моладзі цікаўнасць да таго, што адбываецца ў свеце? Карыстаючыся сацыяльнымі сеткамі, проста немагчыма «выпасці з рэальнасці», любая больш-менш важная падзея адразу становіцца прадметам для абмеркавання карыстальнікамі. Апошнія прыклады — тэракт у Ніцы і спроба дзяржперавароту ў Турцыі. Яшчэ ніводны канал не сказаў пра падзеі ні слова, а ў «Фэйсбуку» і «УКантакце» карыстальнікі вялі прамыя трансляцыі з месца падзей! Дарэчы, магчымасць самому стаць адмысловым СМІ — яшчэ адна перавага інтэрнэту.

Той, хто кажа, што сучасная моладзь абсалютна не цікавіцца жыццём краіны і не мае ўласнага меркавання, відаць, не заходзіў у «Твітар» і на шматлікія блогерскія пляцоўкі. Любая больш-менш важная навіна адразу цягне цэлы шквал эмоцый і думак. Вось толькі апошнія прыклады: дэнамінацыя ў краіне, наступствы нядаўніх ураганаў... Таму перад тым, як рабіць высновы і называць інтэрнэт «звалкай смецця», праверце: а ці праз тую прызму вы на яго паглядзелі?

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Аўтарскае бачанне*

# МАКІЯЖ ЗА ПЯЦЬ ХВІЛІН,

## ці Прыгажосць па... інтэрнэце

**З кожным годам б'юці-блогінг набывае ўсё большую папулярнасць. Апошнія навіны індустрыі прыгажосці, водгукі аб касметычных прадуктах і працэдурах, відэаўрокі макіяжу... Дзяўчаты заўсёды гатовы падзяліцца сваім меркаваннем і расказаць пра тое, што абышлі бокам глянцавыя часопісы. Мы пагаварылі з папулярнай беларускай б'юці-блогеркай Таццянай Уладзіміравай і даведаліся пра ўсе нюансы «прыгожай» справы.**



— Усё атрымалася выпадкова. Каля двух гадоў таму я была ў камандзе візажыстаў адной з касметычных кампаній, дзе нашы работы здымалі на відэа. Вобраз, які я стварыла для мадэлі, публіцы спадабаўся: за лічаныя дні відэаролік на YouTube набраў нечакана вялікую колькасць праглядаў, — успамінае Таццяна. — Але тады я і падумаць не магла, што б'юці-блогінг стане адной з галоўных спраў жыцця.

Сёння канал Таццяны Уладзіміравай на YouTube налічвае 19 тысяч падпісчыкаў. Кожную пятніцу з дапамогай камеры дзяўчына вучыць рабіць модны макіяж усяго за 5 хвілін, з лёгкасцю паўтарае вобраз любімай зоркі, расказвае, якія трэнды актуальныя ў сезоне і не перастае надаваць дзяўчатам упэўненасці ў сабе.

— Я атрымліваю сотні паведамленняў у дзень з просьбай дапамагчы падабраць губную памаду, шампунь, румяны і г.д. Адказаць на ўсе пытанні, зразумела, не хапае часу. Да таго ж, нярэдка вельмі цяжка па фотаздымках зразумець, што параіць канкрэтнаму чалавеку. Але кожны запыт становіцца штуршком для наступнага відэа, — гаворыць Таня.

Дзяўчына прызнаецца, што радуецца кожнаму прагляду, лайку, новаму падпісчыку і каментарыю (нават негатыўнаму). Для відэаблогеркі гэта пацвярджэнне нямарнай працы.

У 2014 годзе Таццяна скончыла Інстытут журналістыкі БДУ. Затым былі шматлікія курсы па цырульніцкім майстэрстве і макіяжы.

— Б'юці-блогінг для мяне — свайго кшталту журналістыка. Гэта як аўтарская калонка, толькі праз відэа. Калі табе ёсць што сказаць, навошта маўчаць? Акрамя гэтага, блогінг дапамагае раскрыцца мне самой. Камера разнявольвае, надае ўпэўненасць, якая расце ад відэа да відэа.

**Першай б'юці-блогеркай лічыцца в'етнамка Мішэль Фан. Яе канал, створаны ў 2007 годзе, набыў вялікую папулярнасць і масу паслядоўнікаў. Па статыстыцы каля 58% інтэрнэт-карыстальнікаў штодня чытаюць і глядзяць блогі. А б'юці-свет з'яўляецца адной з самых папулярных і прыбытковых ніш.**

Пра свой поспех на прасторах беларускага б'юці-блогінгу Таня кажа сціпла. Маўляў, ёсць куды расці ў параўнанні з іншымі краінамі (толькі ў Расіі каналы вядомых блогераў са свету прыгажосці налічваюць каля трох мільёнаў падпісчыкаў). Пра нейкую сусветную вядомасць дзяўчына не марыць, але развіваецца разам са сваёй любімай справай лічыць правільным.

— За пяціхвілінным ролікам стаіць шмат працы. Здымаю, манцірую я сама. У сярэднім відэа ствараецца за чатыры гадзіны. Часцей за ўсё відэаролікі рыхтуюцца загадзя. Хай лепей будзе запас, чым потым растлумачваць падпісчыкам, чаму канал «заснуў».

Пра вялікі заробак на YouTube казаць яшчэ рана. Хіба што толькі на «пакласці на тэлефон» хапае. Б'юці-блогінг больш развіты за мяжой. Там супрацоўніцтва з буйнымі касметычнымі кампаніямі (рэклама) дазваляе дзяўчатам лічыць гэты занятак не толькі сваім хобі, але і «працай», за якую добра плацяць.

— Муж за два гады існавання б'юці-канала не глядзеў ніводнага майго відэа, а матуля, наадварот, чакае кожны выпуск! Увогуле, галоўнае, каб самому блогеру падабалася яго справа! Гэта адчуваецца нават па той бок экрана! Пастаянныя падпісчыкі заўсёды ўлоўліваюць настрой любімага блогера.

У чым сакрэт поспеху б'юці-канала? У яго кантэксце, лічыць Таццяна. І тут трэба праводзіць выразныя межы паміж «асабістым» і «агульным».

— Паказаць у Instagram, куды я ездзіла адпачываць або што апранула ў тэатр, я магу. Што тычыцца падрабязнасцяў майго асабістага жыцця, сям'і — тут табу. Я шмат часу праводжу ў сацсетках, публікуючы чацвінкі свайго «касметычнага жыцця». Гэта дапамагае не толькі прасоўваць канал, але і сведчыць, што я са сваімі падпісчыкамі пастаянна на сувязі.

Тым, хто толькі марыць стварыць свой канал аб прыгажосці, Таня раіць «не цягнуць». Прыйшло натхненне, жаданне, ідэя — рабіце! Не бойцеся першых няўдач. Памятайце: сотні, тысячы, а тым больш мільёны падпісчыкаў на пусты канал не прыйдуць!

***

Заўтра пятніца — на канале Таццяны з'явіцца новае відэа. Спадзяёмся, яно спадабаецца падпісчыкам, а колькасць праглядаў і добрыя каментарыі задаволяць і натхняць аўтара на новыя б'юці-ідэі.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

*Карысныя тэхналогіі*

# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ КАХАННЯ ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ

## Хлопец з Маладзечна збіраецца выпусціць эпатажны мабільны дадатак

**Аляксандр ЕЎДАКІМАЎ заўсёды бярэ з сабой у краму смартфон. Не для таго, каб па дарозе праверыць стужку навін. З дапамогай спецыяльнага дадатку невідушчы хлопец адлічвае патрэбную для пакупак суму. Падносіць па чарзе банкноты да камеры ў тэлефоне, і праграма беспамылкова вызначае кожную. «Пяць рублёў», — агучвае смартфон намінал новенькага чырвонага банкнота. Гэты распазнавальнік купюр для невідушчых Аляксандр зрабіў разам з сябрам два гады таму. З таго часу дадатак беларуса спампавалі больш за чатыры тысячы чалавек. Як сярод карыстальнікаў праграмы аказаліся жыхары М'янмы і Камбоджы і чым здзівіць яго новы мабільны праект, малады чалавек расказаў нашаму карэспандэнту.**



### Сканер і грошы

Аляксандр — выкладчык у Маладзечанскім дзяржаўным музычным каледжы імя Агінскага. Знаёміць студэнтаў з гісторыяй музыкі ў той час, калі яго жонка ў суседніх аўдыторыях вядзе заняткі па сальфеджыа і гармоніі.

Распрацоўваць мабільныя дадаткі хлопец пачаў перш за ўсё для ўласнай зручнасці. Трэба сказаць, што распазнавальнік купюр ужо існаваў. Праўда, сьчытваў ён толькі долары і еўра. Аляксандр звязаўся з аўтарам дадатку і спытаў, ці не дабавіць той у функцыянал беларускія рублі. Распрацоўшчык адмовіўся: маўляў, незацікаўлены ў гэтым, але прадаставіў зыходны код праграмы, з якім дазволіў рабіць што заўгодна.

**Дадатак Blind-Droid Wallet працуе без падключэння да інтэрнэту. Фатаграфаваць купюру не трэба, важна толькі злавіць фокусную адлегласць.**

— Я зразумеў, што без праграміста не абысціся, — кажа Аляксандр. — Звярнуўся ў рускамоўную рассылку невідушчых карыстальнікаў прылад пад «андроід» з прапановай папрацаваць. Адгукнуўся матэматык з Адэсы Алег Тайструк. Ён узяў на сябе ўсю праграмісцкую частку. На мне ж была візуальная праца: сябры, якія бачаць, падказвалі, наколькі якасныя «карцінкі» банкнотаў і ці адпавядаюць яны таму, што агучваецца.

Базу даных праграмы складаюць адсканаваныя купюры (па дзве выявы на кожную — вонкавы і адваротны бакі). Спачатку хлопцы самі сканавалі грошы — беларускія і ўкраінскія. Ужо потым знайшлі ў інтэрнэце, на сайце нумізматаў, банкноты ў лепшай якасці: іх цяпер і выкарыстоўваюць.

Дадатак Blind-Droid Wallet працуе без падключэння да інтэрнэту. Фатаграфаваць купюру не трэба, важна толькі злавіць фокусную адлегласць.

— Можна ўключыць вельмі кантрасную выяву на экране — гэта для тых, хто дрэнна бачыць, — заўважае малады чалавек. — А каб пераключыцца на наступную валюту, дастаткова страсянуць тэлефон.

Дадатак працуе з 80 валютамі. Але, каб карыстальніку было зручна, у праграме па ўмаўчанні ёсць толькі дзве: долары і еўра. Астатнія чалавек сам пампуе (гэтыя «дабаўкі», як і сам дадатак, бясплатныя) і дабаўляе.

Дарэчы, працаваць з новымі беларускімі грашыма праграма была гатова ўжо з першага дня дэнамінацыі. Яшчэ ў сакавіку Аляксандр з дапамогай кіраўніцтва Беларускага таварыства інвалідаў па зроку змог атрымаць ад банка якасныя «карцінкі» будучых купюр. Набор банкнотаў на смартфонах усіх беларускіх карыстальнікаў дадатку абнавіўся аўтаматычна.

— Удасканальваем праграму і далей, — расказвае хлопец. — Працуем па запыце карыстальнікаў. Вось нядаўна дабавілі валюты М'янмы і Камбоджы.

### Калекцыя з 400 пазіцый

Цяпер Аляксандр разам з сябрам працуе над новай ідэяй.

— Гэта дастаткова эпатажны праект для нашай кансерватыўнай публікі, — папярэджвае маладзечанец. — Мы збіраемся выпусціць «Камасутру» для невідушчых. Думаю, мабільны дадатак будзе запатрабаваны і ў нас, і за мяжой.

Апроч уласна «гэтага», у мабільную энцыклапедыю ўключаць любоўныя парады з індыйскай кнігі «Галіны персікаў», са старажытнакітайскіх і старажытнаяпонскіх трактатаў. Плюс сучасная літаратура. Усяго — пад 400 пазіцый. Аляксандр ужо два месяцы перакладае інфармацыю на рускую мову.

— А як вам ідэя мужа? — пытаемся ў Сашавай жонкі.

— Я паставілася спакойна да гэтага захаплення, — кажа Вольга. — Гэта хобі для Аляксандра, і калі яму цікава, то калі ласка. Я не ўмешваюся ў яго работу. Мне абсалютна ўсё роўна, што падумаюць іншыя людзі. А свае зразумеюць правільна.

**Апроч уласна «гэтага», у мабільную энцыклапедыю ўключаць любоўныя парады з індыйскай кнігі «Галіны персікаў», са старажытнакітайскіх і старажытнаяпонскіх трактатаў. Плюс сучасная літаратура.**

У дадатку будзе і другая частка — сэрвіс знаёмстваў. Чалавек, які ўстанавіў праграму, зможа зарэгістравацца ў ім па жаданні і пакінуць свае каардынаты, а таксама інфармацыю пра тое, каго шукае.

— Дадатак абаронены ад уцечкі інфармацыі, — адразу запэўнівае Аляксандр і дадае, што сэрвіс дапамажа падбіраць партнёраў па інтарэсах. Праграма будзе адсочваць, чым з энцыклапедыі цікавіцца чалавек, і прапаноўваць яму пазнаёміцца з карыстальнікамі, якім спадабалася тое ж самае.

Анлайн-«камасутра» для невідушчых, бадай, не апошні праект Аляксандра. У хлопца яшчэ шмат ідэй. Напрыклад, не быў бы лішнім распазнавальнік колеру: нікому не хочацца прыйсці ў госці ў розных шкарпэтках. Разам з тым малады чалавек заўважае, што рабіць неспецыялізаваныя дадаткі даступнымі для людзей з праблемамі зроку нескладана: для распрацоўшчыкаў ёсць пэўныя інструкцыі. Калі іх улічваць, невідушчыя з дапамогай чытальнікаў экрана змогуць карыстацца звычайнымі праграмамі.



Аляксандр ЕЎДАКІМАЎ паказвае распазнавальнік купюр у дзеянні.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*
**Фота аўтара.**
*Мінск — Маладзечна — Мінск.*

*Мары — збываюцца!*

# ПТУШКА ШЧАСЦЯ НАСТАССІ

**Аспірантка біяфака БДУ Настасся Кузьмянкова заўсёды ведала, што стане арнітолагам. Цяпер у яе «калекцыі» 230 відаў птушак, якіх яна бачыла. Аб тым, як дапамагчы беларускай прыродзе і якая птушка-мара «жыве» ў яе на руцэ, яна расказала нашаму карэспандэнту.**



Здымаю на лік «тры». Адзін, два, тры!

Настасся працуе ў грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Упершыню трапіла туды валанцёрам шэсць гадоў таму. За гэты час прафесійна вырасла ў каардынатара праекта.

— Я прыйшла ў гэтую арганізацыю ў пошуках людзей, якія падтрымалі б мяне і паралілі нешта карыснае. Насамрэч, у нас не так шмат даследчыкаў займаюцца вывучэннем птушак. Калі, напрыклад, у Брэсцкай і Гродзенскай абласцях больш арнітолагаў, то ў Магілёўскай, дзе я вырасла, мне не пашчасціла сустрэць каго-небудзь настолькі зацікаўленага, як я. Паступала на біяфак БДУ мэтанакіравана — марыла аб птушках. І вось знайшла прафесійную падтрымку ў АПБ. Зараз я ўжо куратар: каардыную працу над другім выданнем Атласа гняздуючых птушак Еўропы — вялікага праекта, у якім удзельнічае і Беларусь. Гэта кніга падсумоўвае звесткі аб усіх птушках, якія гняздуюцца ў Еўропе. Першае выданне выйшла ў 1997 годзе. Другое пакажа, што адбылося з колькасцю і распаўсюджаннем птушак за мінулы час. Акрамя таго, беларускія даследчыкі ствараюць і першы нацыянальны атлас. Плануецца, што ён выйдзе бліжэй да 2020 года. Над ім сумесна працуюць «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і Навукова-практычны цэнтр Акадэміі навук па біярэсурсах. Зараз прыток інфармацыі неяк ажывіўся, і, мне падаецца, будзе неблагі вынік.

**— Чым вам найбольш падабаецца займацца?**

— Фестываль «Жураўлі і журавіны». Гэта свята праходзіць штогод у Мёрах у Віцебскай вобласці. Арганізуюць яго мясцовыя ўлады, а наша арганізацыя заўсёды падтрымлівае. Праходзіць фестываль у верасні. У гэты час якраз пачынаецца міграцыя шэрага жураўля. Мы звычайна за дзень да мерапрыемства шукаем месцы недалёка ад Мёраў, дзе можна пабачыць гэтых птушак. І ў дзень самога свята арганізуем туды паездкі на аўтобусах. Пакуль туды дабіраемся, гіды (у нас некалькі гадоў адзін з іх — гэта я) распавядаюць пра фестываль, птушак і балота Ельня, якое там недалёка. Менавіта на ім якраз ноччу спыняюцца жураўлі. Людзі прыязджаюць не толькі з Віцебскай вобласці, але і з іншых куткоў Беларусі. Мы адказваем на ўсе пытанні пра птушак і нашу арганізацыю. Часам іх бывае даволі шмат. Заўсёды прыязджаю такая натхнёная з гэтага фестывалю. Там добрая атмасфера.

**— Напэўна, у вас ёсць птушкі і дома?**

— Так. У мяне жыве пара зебравых амадзінаў. Гэта такія ўюрковыя ткачыкі, памерам з вераб'я. Радзіма гэтых птушак — Аўстралія. Яны ўжо некалькі разоў выводзілі птушанят. Яшчэ разам са мной заўсёды хадулачнік, — гаворыць Настасся, паказваючы татуіроўку. — Гэта такі кулік. Птушка для Беларусі залётная: яна не гняздуецца ў нас. У асноўным жыве ў стэпавай і пустыннай зоне Еўразіі. Я зрабіла яе таму, што сама займаюся кулікамі. У мяне і дысертацыя будзе звязана з імі. Хадулачнік — такая птушачка-мара для мяне. Я яе яшчэ ніколі не бачыла і, безумоўна, вельмі хачу на яе паглядзець.

**— Колькі птушак вы пабачылі?**

— Існуе такі «Клуб 200». Яго можна знайсці ў інтэрнэце. Гэта добраахвотнае аб'яднанне сяброў АПБ, якія цікавяцца назіраннямі за птушкамі. Вось там, на сайце, я і вяду анлайн відавы спіс. Усяго ў Беларусі зарэгістравана 325 відаў птушак. Я ўжо адзначыла ў сваім спісе 230. Гэта нядрэнны вынік. Але, безумоўна, ёсць арнітолагі, якія бачылі больш. Адным словам, ёсць яшчэ куды расці. Хоць пасля такой лічбы ўсё больш складана дадаваць новыя віды.

**— Настасся, лес — ён які?**

— У краіне не так шмат засталося лесу рэальна старога, я сказала б, запаветнага. Хоць, згодна з кадастрам, у нас даволі вялікі працэнт тэрыторыі пакрыты лесамі. Іншае пытанне: якім? Бо не напісана, колькі яму гадоў. А гэта важна, таму што лес малады і спелы будзе сур'ёзна адрозніваецца па саставу відаў птушак і звёл, якія яго насяляюць. Ёсць віды, прывязаныя да спелага лесу, напрыклад, глушэц. Чым больш маладых дрэў, тым менш гэта месца прыдатнае для яго жыцця.

**— Якімі даследаваннямі зараз займаецеся?**

— Ёсць такі заказнік «Чырвоны Бор». На яго тэрыторыі я адсочваю глушцоў з радыёметкамі. Ініцыятыва належыць арнітолагу Дзмітрыю Шамовічу. Зразумела, што вясной глушцы на такавішчах, а што яны робяць астатнюю частку года — даволі складана сказаць. Асноўная работа — пошук птушак. Для гэтага выкарыстоўваецца рэсівер і антэна. Кожны перадатчык працуе на ўласнай частаце. Часам за адной птушкай даводзіцца праўсці не адзін кіламетр. Потым атрыманыя звесткі аналізуюцца па сезонах, гадах, біятопах і іншых паказчыках.

**— Як далучыцца да праектаў АПБ?**

— Час ад часу на сайце з'яўляюцца аб'явы, што мы шукаем валанцёраў для нейкай канкрэтнай работы. Акрамя таго, можна напісаць на пошту АПБ і прапанаваць дапамогу. Ёсць офісная праца і выязная, на летніках. Можна выбіраць, як бы вы хацелі сябе задзейнічаць. У нас ёсць кола валанцёраў, на якіх можна спадзявацца і звяртацца да іх у любым выпадку. Гэта таксама прыемна.

**Надзея АНІСОВІЧ.**



Бываюць у лесе і такія сустрэчы.

# Хто «Ракеце» надае «Імпульс»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Акрамя таго, усім студэнтам прыйшлося датэрмінова здаць сесію, каб паспець на першую змену. Тут працуе некалькі дарослых важатых, якія не ўваходзяць у склад педатрада, але гэта таксама выпускнікі БДПУ. Яны дапамагаюць студэнтам і ў нейкай ступені забяспечваюць пераемнасць пакаленняў.

Месца дыслакацыі «Імпульса» — аздараўленчы комплекс «Ракета», што знаходзіцца за лічаныя кіламетры ад мінскай кальцавой дарогі. Цікавая дэталь: адпачываюць тут не толькі дзеці, але і дарослыя, што, безумоўна, накладвае свой адбітак на работу важатых. Як-ніяк, большасць чакае ад адпачынку цішыні і спакою, а калі побач дзеці ва ўзросце ад 6 да 14 гадоў, дабіцца гэтага не так проста.

Мы прыязджаем у цэнтр у сярэдзіне дня. У дзяцей «ціхі час», таму ў важатых ёсць хвілінка, каб расказаць нам пра сваю работу. Ужо ўвечары іх чакае адно з самых адказных мерапрыемстваў змены — важацкі канцэрт.

**«Быць важатым зусім не проста. Асабліва калі працуеш з маленькімі дзецьмі, якія могуць пасярод ночы пастукацца з просьбай пакласці іх спаць ці са слязьмі на вачах, бо сумуюць па бацьках...»**

— Езджу сюды ўжо трэці год, — кажа **камісар атрада «Імпульс», студэнтка цяпер ужо V курса факультэта псіхалогіі БДПУ Аліна ПЕШКУР.** — Мне тут вельмі падабаецца, бо я ведаю персанал, шмат знаёмых дзяцей. Некаторыя нават у госці прыязджаюць спецыяльна — якраз сёння былі двое выхаванцаў з маёй самай першай змены. І цяпер сярод дзяцей ёсць тыя, каго памятаю па ранейшых гадах. Праца ў летніку — гэта нешта асаблівае і незвычайнае, словамі нават цяжка перадаць. Трэба паспрабаваць самому, каб зразумець. Тое, што даводзілася цягам трох месяцаў заставацца пасля заняткаў, каб прайсці ўсе трэнінгі і тэсты, мяне зусім не засмучала. Хоць, канешне, прыкра было б дарэмна патраціць свой час. Дарэчы, з больш як паўсотні кандыдатаў сюды прыехала менш за палову — 23.



Мяжа паміж выхаванцамі і выхавацелямі бывае ледзь заўважнай.

У абавязкі Аліны ўваходзіць арганізацыя работы ўсяго педатрада, падбор важатых, правядзенне трэнінгаў. Асаблівы ўхіл робіцца на «камандаўтварэнне» — усе студэнты павінны ўмець камунікаваць паміж сабой і максімальна аператыўна вырашаць любыя надзённыя пытанні. Яшчэ адзін важны аспект працы — вырашэнне канфліктаў. У дзіцячым калектыве заўжды здараюцца рознага кшталту непаразуменні, і педагог павінен максімальна хутка іх заўважыць і вырашыць.

У будучыні Аліна бачыць сябе ў ролі дзіцячага псіхолага: дзяўчына хоча знайсці працу ў адным з кругласуточных летнікаў. «Усё ж такі работа важатага вельмі сур'ёзна адрозніваецца ад нашай профільнай спецыяльнасці, — канстатуе Аліна. — Праца псіхолага больш індывідуальная, ён займаецца з дзецьмі паасобку. А важаты працуе з цэлым калектывам, і яго задача больш шырокая — не проста дапамагчы дзіцяці, а выхаваць яго. Хоць мы таксама праводзім з дзецьмі розныя тэсты: прафарыентацыйныя, на вызначэнне тэмпераменту і іншыя».

— Я працую тут ужо другую змену запар, — расказвае **важатая 1-га атрада, студэнтка IV курса факультэта псіхалогіі БДПУ Вера РУДЗЬ.** — Раней такога досведу ў мяне не было — толькі ўдзел у праекце «Дзеці сталіцы», падчас якога мы займаліся з дзецьмі, што застаюцца на лета ў горадзе. Уражанні ў мяне пакуль што самыя лепшыя, працуецца лёгка. Нават не ведаю, можа быць, гэта звычайнае шанцаванне, але ніякіх праблем на абедзвюх зменах не было, хоць мне дасталіся самыя старэйшыя дзеці — у нас не такая вялікая розніца ва ўзросце. Дзякуючы папярэдняй падрыхтоўцы, мы ведаем, як сябе правільна паставіць у калектыве і не страціць аўтарытэт. Цяпер нават не магу сказаць, што запомнілася больш за ўсё — тут кожны дзень як адно маленькае жыццё, уражанняў застаецца «вагон»! Што мне падабаецца ў рабоце найбольш? Магчымасць убачыць, чым жывуць цяперашнія дзеці, бо яны ўжо зусім не такія, як мы. Гульня ў валейбол для многіх была ў навінку, а вось, напрыклад, у сучасных гаджэтах выхаванцы разбіраюцца лепш за нас.

Дзень важатага тут распачынаецца а палове восьмай раніцы, а то і раней. Студэнты праводзяць з дзецьмі зарадку, разам снедаюць. Пасля гэтага выхаванцам раздаюць мабільныя тэлефоны — пазваніць бацькам (яшчэ адзін «выхад на сувязь» дазваляецца ўвечары). Акрамя гэтага, ранкам дзеці займаюцца спортам: іх вядуць у басейн, на спелеапрацэдуры, у спартыўныя залы. Вядома, сюды выхаванцаў суправаджаюць важатыя, якія і самі могуць карыстацца магчымасцямі аздараўленчага цэнтра. Пасля абеду і ціхай гадзіны — творчыя мерапрыемствы, падрыхтоўкай якіх таксама займаюцца педатрадаўцы. Конкурсы прыгажосці, парадныйны шоу, канцэрты — праявіць сябе можа кожны. У тым ліку і самі студэнты.

Дарэчы, сярод 23-х педагогаў «Імпульсу» ёсць і два хлопцы. Калі маладым людзям давяраюць самых малодшых дзяцей, фразы кшталту «Аляксандр Віталевіч, а я высмаркалася» нярэдка ставяць хлопцаў у тупік. Зрэшты, некаторыя дзяўчаты таксама прызнаюцца, што «важацкі хлеб» — не заўсёды лёгкі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Важацкі канцэрт прыйшоўся даспадобы ўсім.

**Яшчэ адзін важны аспект працы — вырашэнне канфліктаў. У дзіцячым калектыве заўжды здараюцца рознага кшталту непаразуменні, і педагог павінен максімальна хутка іх заўважыць і вырашыць.**

— У дзяцінстве я праводзіла ў летніках не менш за дзве змены штогод, — кажа **важатая 6 атрада, студэнтка III курса факультэта псіхалогіі БДПУ Кацярына НЕЛЮБ.** — Менавіта гэта і абумовіла маю цікаўнасць да працы ў «Імпульсе». Але на практыцы аказалася, што быць важатым зусім не проста. Асабліва калі працуеш з маленькімі дзецьмі, якія могуць пасярод ночы пастукацца з просьбай пакласці іх спаць ці са слязьмі на вачах, бо сумуюць па бацьках...

Напрыканцы пытаемся пра заробак. За першую змену (18 дзён) усе важатыя атрымалі па 280 рублёў. Відаць, недарэмна многія рашыліся на няпростыя месяцы падрыхтоўкі? Зрэшты, самі студэнты сцвярджаюць, што заробак для іх стаіць далёка не на першым месцы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 10 августа 2016 года повторных торгов с условиями по продаже квартир, принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена | Размер задатка |
| 1. | **Квартира № 6 по адресу: г. Минск, ул. Академика Карского, 27-6 (трехкомнатная, 1 этаж, общая площадь – 76,2 кв. м)** | 114 082 бел. руб. (1 140 820 000 бел. руб. образца 2000 года) | 11 400 бел. руб. (114 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| 2. | **Квартира № 104 по адресу: г. Минск, ул. Академика Карского, 27-104 (трехкомнатная, 15 этаж, общая площадь – 75,1 кв. м)** | 119 137 бел. руб. (1 191 370 000 бел. руб. образца 2000 года) | 11 900 бел. руб. (119 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |

**Продавец имущества:** ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со стст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский домостроительный комбинат», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов после предъявления копии платежных документов о перечислении вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанного на нем перехода права собственности, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Торги проводятся **10 августа 2016 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 21.07.2016 по 08.08.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефонам: (017) 207-20-60, (044) 777-11-58.**

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017) 207-20-60, (044) 777-11-58 (ОАО «Минский домостроительный комбинат»).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 22.08.2016 г. в 15.30**
**по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 104 (конференц-зал «Консул»).**

### Организатор – республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**ЛОТ 1.** Помещения №№ 157,158,159, площадью 63,2 кв.м, на втором подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, водоснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 214, 88 руб.; размер задатка – 21,49 руб.; целевое использование – размещение автомойки; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

Ремонт помещений (в случае его необходимости) и приведение в соответствие правоустанавливающих документов и технической документации осуществляется арендатором самостоятельно, за счет собственных средств без последующего возмещения стоимости работ арендодателем.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 22.07.2016 г. по 18.08.2016 г. с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Кирова 18, к. 602. Документы, поданные после 16.00 18.08.2016 г., не рассматриваются.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код банка – 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель» и предоставляет копию платежного документа; подает заявление на участие в аукционе, заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Помимо указанных документов:

**Физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность.

**Индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации.

**Юридическое лицо** – **резидент** – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; **нерезидент** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

**Порядок определения победителя аукциона:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона, до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену.

**Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 2000,00 руб.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефоны для справок: (8-017) 229-70-39, (8-029) 117-56-22.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

| |
|---|
| **Продавец: ОАО «Доломит», Витебская обл., г.Витебск, г/п Руба, ул. Центральная, 23, 8 (0212) 57-85-08.** |
| Лот №1. Изолированное помещение с инв. №200/D-176885 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-1, площадью 15,8 кв. м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 451,42/4 514 200 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 45,14/451 400 бел. руб. |
| Лот №2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176887 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-2, площадью 16 кв. м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 457,21/4 572 100 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 45,73/457 300 бел. руб. |
| Лот №3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176888 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-3, площадью 15,4 кв. м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 440/4 400 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 44/440 000 бел. руб. |
| Лот №4. Изолированное помещение с инв. № 200/D-176889 по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 19А-4, площадью 14,4 кв. м, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – помещение хозсарая. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 411,38/4 113 800 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 41,14/411 400 бел. руб. |
| Лот №5. Капитальное строение с инв. №200/С-51431, площадью 53,7 кв. м, назначение, наименование – Здание неустановленного назначения, по адресу: Витебская обл., г/п Руба, ул. Центральная, д. 23а, на зем. участке площадью 0,0316 га. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 5600/56 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 560/5 600 000 бел. руб. |
| Лот №6. Капитальное строение с инв. №200/С-96175, общая площадь застройки 1768 кв.м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – силосный склад цеха №2, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, г/п Руба, ул. Центральная, 25/31, на зем.участке площадью 41,6313 га (долевая аренда). Нач. цена (с учетом/до деноминации): 81 200/812 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 8120/81 200 000 бел. руб. |
| Аукцион состоится **22.08.2016 в 15.00** по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 21.07.2016 с 8.30 по 19.08.2016 до 17.30.** Срок подписания договора купли-продажи: 5 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. |

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. **Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан**: перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА В БОБРУЙСКОМ РАЙОНЕ

| Номер лота по порядку | Местоположение земельного участка | Начальная цена | Размер задатка | Расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения | Условие проведения аукциона | Характеристика земельного участка | Кадастровый номер | Инженерная и транспортная инфраструктура | Дата проведения аукциона | Последний день приема заявлений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Бобруйский район, Сычковский сельисполком д. Щатково, пер. 3-й Масловского, 2 | 1 450 рублей 9 копеек | 145 рублей 1 копейка | 1 563 рубля 58 копеек (расходы возмещает победитель аукциона) | Наличие не менее двух участников | Площадь 0,1464 га | №720884012601000236 | возможность подключения к централизованному электроснабжению | 22.08.2016 г. | 16.08.2016 г. до 17.00 |

**ПРИМЕЧАНИЕ.**

Аукцион состоится в 15.30 по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, 2-й этаж, малый зал заседаний. Заявления принимаются по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 215-а, каб. 61, в рабочие дни с 08.00 до 17.00 с 1-ого дня после публикации извещения в СМИ. Информация о земельных участках по контактным телефонам в г. Бобруйске: 72-05-40, 71-74-30.

Для участия в аукционе гражданин Республики Беларусь (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в комиссию по проведению аукционов:

- заявление на участие в аукционе (с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка);

- заверенную копию платежного поручения о внесении задатка (10% от начальной цены) на расчетный счет Сычковского сельисполкома №3600712110013 в АСБ «Беларусбанк» филиал 703, код 760, УНН 700045734, код платежа 04901;

- представителем гражданина Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

- при подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Порядок проведения аукциона:

1. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный счет задаток.

2. Первая объявленная аукционистом цена предмета аукциона определяется в соответствии с шагом аукциона. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем в отношении соответствующего предмета аукциона.

3. При отсутствии лиц из участников аукциона, готовых выкупить предмет аукциона по названной цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера.

4. Предмет аукциона снимается с аукциона по решению комиссии или организации до начала проведения аукциона в случае отсутствия участников аукциона либо если на объект аукциона претендует только один гражданин.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель аукциона обязан внести плату за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

Гісторыя ў рэчах

# ВЫРАТАВАННЕ «НЯМІГІ»,

## ці Калі долар замяняла «чарапашка»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Такі экспанат ацэняць тыя, хто вырас у 90-я. Nintendo NES — легендарная прыстаўка тых часоў і аб'ект дзясяткаў, калі не соцень, падробак.

**Пару гадоў таму ў Беларусі адбылася першая выстава рэтра-камп'ютараў: некалькі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі сабралі ў адным месцы дзясяткі экспанатаў, якія маглі абудзіць настальгію, пэўна, у любога хлопца, дзяцінства якога прыпала на 80-я ці 90-я гады. Тады мерапрыемства прыйшлося даспадобы публіцы, пра яго напісалі і шматлікія выданні. Пасля выставы хлопцы прывезлі разы ў тры болей камп'ютараў, чым выстаўлялі, — людзі з радасцю прыносілі ім свае рарытэты і перадавалі іх на захаванне. Але да стварэння першага айчыннага музея вылічальнай тэхнікі справа, здаецца, наблізілася толькі цяпер. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» сустрэліся з калекцыянерам Аляксандрам АЛЯКСАНДРАВЫМ і распыталі пра будучыню яго камп'ютарнага «сямейства».**

З цяпер ужо магістрам кафедры інфарматыкі БДУІР мы сустракаемся ў адным з інтэрнатаў сталічнай Студэнцкай вёскі. Адно з памяшканняў часова аддалі камандзе музея Bytespace для захавання экспанатаў. Увесь пакой застаўлены самага рознага кшталту рэтра-тэхнікай: манітарамі-«акварыумамі», сістэмнымі блокамі, скрынямі з літаратурай, прыстаўкамі і многім-многім іншым. Тут жа і «гаспадар» калекцыі. Аляксандр за работай — якраз у гэтыя хвіліны з велізарнага камп'ютара СМ-1420 вагой больш як 100 кілаграмаў (ім раней карысталіся ў Нацыянальнай акадэміі навук), а, дакладней, з запушчанай на ім «бабіны», інфармацыя перакідваецца на звыклы і зразумелы кожнаму планшэт.

— Тэхнікай я цікаўлюся вельмі даўно, — расказвае хлопец. — У тры гады мне падарылі першы камп'ютар — «Байт», які збіралі ў маім родным Брэсце. На ім я вучыўся чытаць, а пазней — і праграмаваць. Калі мне было гадоў восем, я «дарваўся» да часопісаў «Радыё», якія выпісваў тата. У гэтым выданні знайшоў схему самаробнага камп'ютара, прапанаваў бацьку разам яго сабраць. Памятаю, як сядзелі і самі напайвалі мікрасхемы на плату... Усё атрымалася — так у мяне з'явіўся ўжо другі ПК. А пасля — пайшло быццам бы само па сабе. Адзін старэнькі апарат мне падарыў аднакласнік, яшчэ адзін прыслаў інтэрнэт-знаёмы пасля перапіскі на тэматычным форуме. А потым сябра сям'і аддаў столькі машын, што мы загрузілі імі цэлы «Масквіч».

Усё гэтае «сямейства» захоўвалася Аляксандрам у невялікім хлеўчуку. Хлопец паціху перабіраў калекцыю, рамантаваў асобныя машыны, вывучаў незнаёмыя. Марыў, што некалі сам зможа набываць сабе новыя экспанаты, бо бацькоўскі бюджэт абцяжарваць сваім захапленнем прынцыпова не хацеў: сям'я з чатырох чалавек і так мясцілася ў інтэрнаце. А пасля паступу ў Мінск, пачаў атрымліваць стыпендыю і зарабляць якія-ніякія грошы. Пачаўся перыяд «барахолак» на Ждановічах і палявання за рэдкімі, хай сабе і «паўмёртвымі» экспанатамі. Хлопец прызнаецца, што спачатку практыкаваў і развешванне аб'яў у стылі «Куплю ваш стары камп'ютар», але звычайна гэта заканчвалася тым, што Аляксандр заставаўся зусім без грошай — усё спускаў на новыя «цацкі». Увесь хлам калекцыянер перабіраў і рамантаваў тое, што было можна. На адзін камп'ютар выходзіла каля двух тыдняў.

Ідэя выставіць сабраныя экспанаты на асобнай выставе нарадзілася ў 2013 годзе. Ва ўніверсітэце запісвалі цыкл перадач пра студэнтаў, у якіх ёсць якія-небудзь незвычайныя хобі, і намеснік дэкана прапанаваў хлопцу паказаць свае машыны.

— Я прывёз усе камп'ютары ў адзін са сталічных хакерспэйсаў, мы «адзняліся», і адміністрацыю ўніверсітэта гэта «зачапіла», — узгадвае калекцыянер. — Паспрабавалі правесці першую выставу для школьнікаў. Мне дапамагаў яшчэ адзін магістр БДУІР (на той момант аднагрупнік) Віктар Козуб, які цяпер займаецца менеджментам і сувязямі з грамадскасцю. Паглядзець экспазіцыю прыйшоў рэктар, і менавіта ён прапанаваў нам стварыць асобны музей. Тады ж мы атрымалі і гэтыя памяшканні ў інтэрнаце (яшчэ адно знаходзіцца паверхам ніжэй), каб захоўваць машыны. Трохі пазней да каманды далучылася выпускніца ўсё таго ж БДУІР Таццяна Нарубіна. Дзяўчына ўзяла на сябе дызайн: расстаноўку экспанатаў, афармленне памяшканняў, сайта, візітак і іншае. Пасля гэтага Bytespace нават перамог на конкурсе гарадскіх праектаў #РазамМінск і атрымаў чэк на 500 долараў.



Адных манітораў у калекцыі — незлічоная колькасць.

Колькі экспанатаў у калекцыі цяпер — не ведае нават сам стваральнік. Тым больш у некаторых выпадках цяжка вызначыцца, што менавіта лічыць «экспанатам». Носьбіты, кантролеры, прылады ўводу-вываду, самыя розныя тэрміналы — усё гэта можна назваць камп'ютарнай тэхнікай, але ўласна камп'ютарам — не.

— Што мяне цікавіць у старой тэхніцы? — перапытвае хлопец. — Цяпер усё робіцца па адных і тых жа «лякалах»: існуе толькі некалькі розных сямействаў аперацыйных сістэм, «жалеза» таксама паўсюль аднолькавае. Раней жа кожная фірма, кожны завод ствараў нешта сваё. Розныя архітэктуры і софт узнікалі, як грыбы пасля дажджу. Адсюль і розныя магчымасці: у аднаго 16 колераў, у іншага — 32, той працуе з перфастужкай, гэты — з дыскетамі... З аднаго боку, гэта было нязручна, бо атрымліваўся такі велізарны «заапарк» несумяшчальных паміж сабой машын, з іншага — у кожным з камп'ютараў ёсць нешта сваё ўнікальнае і цікавае.

Вось, напрыклад, восем выратаваных «Нямігі» — беларускіх школьных камп'ютараў, якія выпускаліся ў 90-я. Самая каштоўная іх частка — дыскаводны блок. Усталяваную ўнутры плату набыць на рынку нерэальна, бо іх выпускалася вельмі мала (калі на клас размяркоўвалася шмат машын, то дыскавод прызначаўся толькі для настаўніка) — нават «мацёрыя» калекцыянеры мяняюць гэту дэталь толькі на штосьці вельмі дарагое.

Побач — легендарны «Карвет». Камп'ютар, які выпускалі ў тым ліку і ў беларускім Брэсце, знаёмы, пэўна, кожнаму школьніку 90-х. Але менавіта гэты асобнік унікальны, на корпусе выбіты серыйны нумар — 00001. Менавіта ён першым сышоў з беларускага канвеера. Увогуле, у савецкіх машынах вельмі шмат незвычайнага і нават кур'ёзнага. Скажам, на клавіятуры тых жа «Карветаў» няма сімвала долара, замест яго — так званая «чарапашка» (кружок з чатырма рысачкамі).

— У будучыні я б хацеў, каб наш музей быў падобны да тых, што ўжо існуюць у Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, — кажа Аляксандр. — Маштабы там, вядома, непараўнальныя, гэта сапраўдныя музеі «з вялікай літары». Аднак, што большасць камп'ютараў знаходзяцца «пад шклом», прапрацаваць з імі не даюць. Я ж усё-такі прыхільнік таго, што для сапраўднага «знаёмства» трэба неяк паўзаемадзейнічаць з машынай. Гэта ж камп'ютар — нават экскурсавод непатрэбны, бо ён лёгка раскажа пра сябе сам.

Ужо хутка Bytespace запрацуе на пастаяннай аснове — нядаўна камандзе выдзелілі адно з памяшканняў Мінскага радыётэхнічнага каледжа.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Эстафета бяспекі

# ДАПАМАГЧЫ САБЕ І СЯБРУ

**Сёння юныя ратавальнікі змагаюцца каманда супраць каманды. Праз дзесяцігоддзі яны выратуюць свет, а пакуль хутка аказваюць першую дапамогу, праходзяць паласу перашкод і спаборнічаюць у пажарнай эстафеце.**



Юны гамяльчанін Мікіта Гаршынін у дзень закрыцця XIV Міжнароднага злёту юных ратавальнікаў-пажарнікаў памераўся сілай з міністрам па надзвычайных сітуацыях Уладзімірам Вашчанкам. Хлопец гаворыць, што адчуў не толькі моц рукі самага галоўнага ратавальніка краіны, але і неабходнасць самому ўдаскальвацца.

Дарэчы, пазмагацца ў маляўнічае мястэчка Баравое пад Гомелем, дзе знаходзіцца ліцэй інжынерных інстытута МНС, прыехалі сёлета каманды юных ратавальнікаў з 12 краін свету: Беларусі, Балгарыі, Азербайджана, Грузіі, Італіі, Казахстана, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Сербіі і Украіны.

На працягу дзевяці дзён юныя ратавальнікі выяўлялі самых спрытных і хуткіх, кемлівых і... прыгожых. Падлеткі сталі ўдзельнікамі трэнінгаў і майстар-класаў, падчас творчых конкурсаў знаёміліся сябро́ў з асаблівасцямі сваіх нацыянальных культур, спаборнічалі за званне «Містар» і «Міс» злёту.

Праграма маштабнага дзіцячага лагера была насычанай і разнастайнай. Конкурсы па дартсе, развядзенні вогнішча, аказанні першай медыцынскай дапамогі, баявым разгортванні і нават ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі тэхнагеннага характару вызначалі падрыхтаванасць маладых людзей да дзеянняў у складаных жыццёвых сітуацыях.

Асноўнай мэтай спаборніцтваў дарослыя лічаць памяншэнне колькасці выпадкаў гібелі і траўматызму дзяцей, навучанне іх навыкам паводзін у надзвычайных сітуацыях, фарміраванне культуры бяспекі ў грамадстве, абмен вопытам і новымі формамі работы. Дарэчы, самі дзеці называюць сярод асноўных дасягненняў магчымасць пазнаёміцца і завязаць стасункі з аднагодкамі з іншых краін. Агульную мову ўсе знаходзілі хутка — дапамагалі эмоцыі, якіх было зашмат на працягу спаборніцтваў.

На базе ліцэя быў адначасова адкрыты і рэспубліканскі палявы лагер «Ратавальнік», у які сабраліся лідары і пераможцы абласных этапаў аналагічных спаборніцтваў Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратавальнікаў-пажарнікаў. Яны здзіўлялі высокіх гасцей, сярод якіх былі і паслы Украіны, Расіі, Сербіі, Казахстана і Італіі, «цыркам бяспекі» і «карчмой прысмакаў»...

Што тычыцца вынікаў міжнароднага форуму юных ратавальнікаў — тут не было роўных нашым суайчыннікам. «Серабро» заваявала каманда з Грузіі, на трэцім месцы — украінцы. Яркай фінальнай кропкай XIV Міжнароднага злёту юных ратавальнікаў-пажарнікаў стаў канцэрт. Яго ў нацыянальных традыцыях кожнай з краін-удзельніц падрыхтавалі каманды. Пры гэтым канцэптуальна яны ўсе разам выратоўвалі свет ад знішчэння і знешніх пагроз. Падчас цырымоніі закрыцця пераможцам уручаны кубкі і памятныя падарункі.

**Міністр па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь Уладзімір ВАШЧАНКА** звярнуў увагу на тое, што сёння пытанні бяспекі дзяцей — вельмі актуальная праблема ва ўсіх краінах.



— Дзеці — гэта наша будучыня, стратэгічны запас краіны, таму рабоце з падрастаючым пакаленнем у нас надаецца асаблівая ўвага, — сказаў ён. — Стасункі паміж дзецьмі на Міжнародным злёце юных ратавальнікаў вельмі шчырыя, што дае магчымасць спадзявацца на далейшае замацаванне зносін паміж ратавальнікамі розных краін. Размова — пра замацаванне доўгатэрміновага партнёрства і супрацоўніцтва паміж дзяржаўнымі, грамадскімі і міжнароднымі структурамі ў гэтай сферы. Нашы падлеткі не толькі па падручніках ведаюць, як лепш прыйсці на дапамогу, яны сапраўды могуць дапамагчы і сабе, і сваім сябрам.

Вядома, што налета геаграфія краін-удзельніц злёту будзе пашырана. Ужо маюць намер прыслаць сваіх прадстаўнікоў Турцыя і Пакістан. Таксама вывучаюць магчымасць удзелу ў міжнародным злёце каманды юных ратавальнікаў Кітая, Японіі і Бразіліі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

SEX-БАЛЯСЫ

# ЦЕЛА ЯК БІЗНЕС?

**Вы ўжо паспелі адчуць усё хараство лета? Водпускі, паходы на пляж ці ўвогуле — паездкі на мора... Галоўнае, каб бліжэй да такога доўгачаканага сонейка! («Няхай заўсёды будзе лета! Няхай заўсёды будзе водпуск! Няхай заўсёды будуць грошы! Няхай пры іх буду я!») Яно, пяшчотнае, нас ужо і сагрэла, і распранула. Але, як і ў любога медаля, тут ёсць і другі бок, што традыцыйна праяўляе сябе менавіта з павышэннем градуса навакольнага асяроддзя. Можа, канешне, выпадковасць, але мноства навін на адну тэму прыйшліся якраз на час, калі пацяплела і на нас засталося мінімум адзення. Як высветлілася, для некаторых нават ён — гэта занадта шмат. Чулі, што ў Лондане адкрылі рэстаран для голых кліентаў? Паўтараю, для цалкам аголеных. Арганізатар праекта ўпэўнены, што пляжа і саўны некаторым ужо не хапае, трэба дадаць яшчэ і магчымасць «натуральнага прыёму ежы».**


Фота Надзеі БУЖАН.

Гатаваць ва ўстанове будуць без газу і святла, таму кухня плануецца пераважна вегетарыянская, унутры кліентаў чакаюць столікі-пянькі, бамбукавыя перагародкі і свечкі ў якасці альтэрнатывы лямпам. Паўаголеныя афіцыянты будуць падаваць стравы на гліняных дошчачках і з ядомымі прыборамі. (Прыгадваецца савецкі анекдот перыяду дэфіцыту. «У кавярні афіцыянтка падае заказ кліенту. «Вось ваша першая страва, вось другая. А трэцяй, прабачце, няма. Хоць сама лажыся! — Тады дзве трэція!»). Рэстаран разлічаны ўсяго на 42 чалавекі, але на яго наведванне пададзена ўжо больш як 46 тысяч заявак! Вось толькі адна неспадзяванка: сэлфі ва ўстанове будуць пад забаронай, усе гаджэты забяруць на ўваходзе. Цікава, колькі чалавек перадумае ісці ў рэстаран з гэтай прычыны? Бо зараз многіх хлебам не кармі — дай толькі «сябішку» зрабіць. А ў гэтым выпадку — яшчэ і ва ўсёй «красе» можна было б! Такое сэлфі дакладна не ва ўсіх будзе!

Ды што рэстаран? Увосень наступнага года павінен адбыцца першы ў свеце круіз для «дарослых». Судна выправіцца ў плаванне на тыдзень па Адрыятычным моры з заходам у порты Славеніі і Харватыі. Абяцаюць, што для ўдзельнікаў на борце будуць праходзіць правакацыйныя вечарынкі, тэматычныя гульні (баюся ўявіць, якія), кулінарныя спаборніцтвы (прыкладам рэстарана навеяла?). Асабліва падкрэсліваецца, што нашэнне адзення — не абавязковае. Пра сэлфі, дарэчы, нічога не згадваецца, уяўляеце, што потым чакае сеціва? А карыстальнікі яшчэ занепакоены лёсам экіпажа, маўляў, на іх што, з адзення татуіроўкі ў выглядзе цяльняшак будуць? («Сімпатычныя хлопцы шкло ў машыне не таніруюць. ДАІ».)

А ці чулі, да чаго дадумаліся ў Кітаі? На фоне рынку выдачы крэдытаў анлайн, які хутка расце, іх там пачалі выдаваць з асаблівым відам забеспячэння. У выпадку, калі пазычальнік не зможа своечасова ці цалкам выплаціць суму, крэдытор пагражае апублікаваць у сеціве ці даслаць яго бацькам... інтымныя фатаграфіі. Пішуць, што дзяўчаты-студэнткі (асноўныя пазычальнікі; пра хлопцаў, дзякуй богу, не паведамляюць) павінны сфатаграфавацца аголенымі са сваім пашпартам. Як вам «асаблівы від забеспячэння»? Самае цікавае, ёсць мноства прыкладаў таго, што некаторыя крэдыторы прадаюць атрыманыя ад маладых пазычальнікаў інтымныя фатаграфіі нават пасля таго, як тыя цалкам пагасілі крэдыт. На што карыстальнікі сеціва трапна адрэагавалі фразай: маўляў, у нас такая форма крэдытаў немагчымая — была б процьма невяртанняў, бо многія і самі бясплатна ўсё выкладваюць...

> **Пішуць, што дзяўчаты-студэнткі павінны сфатаграфавацца аголенымі са сваім пашпартам. Як вам «асаблівы від забеспячэння»?**

Як відаць, цяпер цела напоўніцу выконвае функцыі плацежнага сродку. Такі сучасны банкаўскі тэрмінал, які заўсёды з табой. Так здарылася не сёння, проста дзякуючы сучасным тэхналогіям гэты працэс набыў адмысловыя, скажам так, формы. Але і тут трэба з розумам ставіцца да праблемы. Вось, напрыклад, наваспечаны мэр Лондана забараніў, як ён лічыць, сексісцкую рэкламу ў грамадскім транспарце. Гаворка пра тую, «што прымушае людзей саромецца свайго цела ці падпарадкоўваецца навязаным стэрэатыпам знешнасці». Кшталту рэкламы харчовых дабавак, у якой людзям задавалі пытанне: «Ці гатова тваё цела да пляжнага сезона?» На плакатах, якія так абурылі мэра, была выява мадэлі ў бікіні. І якая ў тым крамола? Аднак кіраўнік горада гне сваю лінію: маўляў, ён як бацька дваіх дзяўчат-падлеткаў вельмі занепакоены падобнага кшталту рэкламай, бо яна зневажае людзей, асабліва жанчын... («Я прыхільніца здаровага харчавання. — Ты ж жарэш усё без разбору! — А хіба гэта не здарова?!») Я, дарэчы, быў некалі на стажыроўцы ў Лондане, жыў у цэнтры горада. І звярнуў увагу на тое, што ў рэстаране гатэля нас абслугоўвалі самыя звычайныя жанчыны-негрыцянкі, пра знешнасць якіх можна было б пажартаваць накшталт «маё стройнае цела знесла бурнае пячэнне». Злавіў сябе на думцы, што ў нас у такім рэстаране афіцыянткамі абавязкова працавалі б даўганогія мадэлі.

...Што скажаш пра ўсю гэтую, без перабольшвання, маніякальную пагоню за ідэальным целам? Апошнім часам людзі ўсё больш клапоцяцца аб яго стане, забываючы пра стан душы. Але свет не робіцца лепшым толькі ад таго, што ў ім жывуць «ідэальныя» людзі, не гаворачы ўжо пра тых, хто «зрабіў сябе лепшымі». Такі вось клопат пра ўласнае цела, на жаль, ужо ператвараецца ў своеасаблівы бізнес. Што тут яшчэ можна дадаць?.. Раней казалі — свет выратуе прыгажосць. Зараз часам хочацца спытаць: а ці можа быць паратункам тое, што прадаецца ў прамым і пераносным сэнсе направа і налева?..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «ГАЛОЎНАЕ, КАБ ЦАНІЛІ НЕ ТОЛЬКІ ЗА ЗНЕШНАСЦЬ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

***— Іншымі словамі, канкурэнцыя не вышэй за жаданне сябраваць і будаваць добрыя стасункі з іншымі канкурсанткамі?***

— Сама асабіста ехала на конкурс з жаданнем пазнаёміцца з новымі людзьмі і пасябраваць з імі. Хоць, безумоўна, мелася і жаданне паказаць сябе. Для фіналу са шматлікіх прэтэндэнтак адабралі найлепшых дзяўчат. І гэта адчувалася па іх размовах, па тым, як яны ставіліся да іншых канкурсантак. Я не адчувала канкурэнцыі. Ды і вырашала ўсё прафесійнае журы.

***— Пад адным матэрыялам пра вас сустрэла каментарый, быццам у дзяўчыны зусім не беларуская знешнасць...***

— Упершыню пачула такі водгук і, магчыма, гэта дасць мне глебу для роздуму. Але ў маёй сям'і ўсе беларусы. Бацька бландзін з блакітнымі вачамі, а вось мама цёмнавалосая і ў яе карыя вочы. І знешнасцю я падобная на яе. Зразумела, што асабліва за мяжой вобраз беларускі прадстаўляюць сабе стэрэатыпна — светлыя валасы, блакітныя вочы... Але азірніцеся навокал і вы ўбачыце, наколькі мы ўсе непадобныя адзін на аднаго. І ў нашай унікальнасці і крыецца сапраўдная прыгажосць.

***— Калі гаварыць пра «Міс Беларусь» з пазіцыі, што не толькі знешняя прыгажосць характарызуе сапраўдную асобу, то дзяўчыну, годную такога тытула, як можна ахарактарызаваць?***

— На мінулым конкурсе два гады таму генеральны дырэктар АНТ Рыгор Кісель адзначыў, што «Міс Беларусь» у першую чаргу павінна быць разумнай, адукаванай, выхаванай дзяўчынай, і толькі потым сваю ролю адыгрывае прыгажосць. З такім меркаваннем я цалкам згодная. Гэта свайго роду формула для тых дзяўчат, якія мараць патрапіць на конкурс. Але з кожным годам дадаецца і нейкая новая нотка, напрыклад, сёлета ёю стала тэма беларускасці. У нас актыўна адраджаюцца нацыянальная культура, інтарэс да роднай мовы. І «Міс Беларусь» павінна добра ведаць гісторыю сваёй краіны, мову... Таксама я за натуральную прыгажосць. На мой погляд, дзяўчаты, якія прадстаўляюць краіну, павінны быць натуральнымі. Я не прыхільнік нават нарошчаных пазногцяў, валасоў і гэтак далей. Мы нараджаемся ўнікальнымі ад прыроды, таму не бачу сэнсу імкнуцца быць такімі, як усе. Зразумела, варта падтрымліваць форму з дапамогай спорту і здаровага ладу жыцця, за што вам арганізм будзе ўдзячны і ўзнагародзіць здароўем.

***— На конкурсе прыгажосці ў Малайзіі вам давялося спаборнічаць з некаторымі ўжо тытулаванымі прыгажунямі. Наколькі гэта было складана?***

— Я, як чалавек, які заўсёды шукае пазітыў, бачыла вакол сябе добразычлівых людзей. З нас там «выціскалі» па максімуме: мы здымаліся ў рэкламе, наведвалі дзіцячыя дамы і прытулкі для састарэлых... Нам было, паверце, не да канкурэнцыі. Зразумела, дзяўчаты з тытуламі адчувалі сябе больш упэўнена, але кожная з нас годна прадстаўляла сваю краіну.





> **«Я не лічу, быццам адны з нас выйгралі, а іншыя засталіся ў пройгрышы. Бо два варыянты жыцця пасля конкурсу — надта малы выбар».**

***— Вопыт працы ў якасці фотамадэлі ў Парыжы, удзел у маштабных конкурсах прыгажосці неяк адбіваюцца на вашай самаацэнцы?***

— Ніколі не задумвалася пра гэта, бо лічу саму сябе звычайнай дзяўчынай. Думаю, кожная можа дабіцца яшчэ больш вышыняў. Няма мяжы дасканаласці. Усе ж мы ідзём да нейкай мэты ў жыцці. Варта не блытаць мадэляў і канкурсантак, узяць, напрыклад, «Міс Беларусь». Першыя — гэта дзяўчаты-карцінкі, іх мы бачым на подыуме, на фота ў розных часопісах, а другія... Папрацаваўшы ў Парыжы я зразумела, што быць топ-мадэллю — абсалютна не мой варыянт, таму што такая праца патрабуе вялікіх фізічных высілкаў, а мне больш імпануе разумовая дзейнасць. І стаяць 12 гадзін на абцасах не кожная вытрымае... Гэта не мая мара. Займацца мадэльнай справай — хобі, а ў перспектыве я бачу сябе рэалізаванай у нечым больш сур'ёзным. Мне падабаецца юрыспрудэнцыя. Увогуле, лічу, што права павінен вывучаць кожны чалавек...

***— Калі гаварыць пра ўвагу з боку моцнай паловы, як яе ўспрымаеце?***

— Я не ведаю, ці многія праяўляюць да маёй асобы інтарэс, таму што не прывыкла да мужчынскай увагі. Са мной рэдка здараюцца сітуацыі, каб на вуліцы да мяне падыходзілі і казалі, што я прыгожая. У тых жа сацыяльных сетках мне можа нехта напісаць, аднак сур'ёзна ўсё гэта не ўспрымаю. Бо ў мяне ёсць малады чалавек, і ён мой ідэал мужчыны. З ім мы духоўна блізкія людзі. Нам добра і камфортна разам, і такога ўзаемаразумення я яшчэ не адчувала. Увогуле, калі казаць, што для мяне важна ў стаўленні іншых да сябе, то самае галоўнае, каб мяне цанілі не за знешнасць. На жаль, апошнім часам мы часта сутыкаемся са стэрэатыпам, быццам прыгожыя дзяўчаты неразумныя, распусныя і гэтак далей. Я, напрыклад, проста пазбягаю зносін з тымі, хто з'яўляецца прыхільнікам такой распаўсюджанай пазіцыі.

***— Дастаеўскі сказаў, што свет уратуецца прыгажосцю, маючы на ўвазе ўнутранае хараство. Ці падзяляеце такое меркаванне?***

— Калі б у мяне была магчымасць з дапамогай прыгажосці спыніць войны, тэрарызм ва ўсім свеце, то я абавязкова імкнулася б ёю скарыстацца.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 20.07.2016 г.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Ва ўяўленні многіх сённяшніх чытачоў казкі для дарослых — гэта творы, якія дзецям чытаць катэгарычна забаронена. Згодна з такой логікай, у якасці прыкладу адразу прыходзяць на памяць «Рускія запаветныя казкі», сабраныя А. Афанасьевым, ці «Казкі для дарослых» Адама Глобуса (зразумела, пералік імёнаў далёка не поўны).**

**Але той, хто спадзяецца знайсці ў апавяданні Генадзя Аўласенкі нешта непрыстойнае, можа расчаравацца: падчас сваіх чарговых сустрэч з вучнямі аўтар (між іншым, хоць і былы ўжо, але настаўнік з больш чым дваццацігадовым стажам) можа смела чытаць альбо пераказваць яго ў любой школьнай аўдыторыі. Зрэшты, як і ў дарослай таксама.**

**Алесь БАДАК**



# ГІСТОРЫЯ АДНОЙ КАЗАЧНАЙ ФЕІ

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

У рэальным жыцці феям няма месца, але ў казачных гісторыях яны час ад часу ўсё ж сустракаюцца. У тым ліку і лясныя...

У адным казачным лесе жылі менавіта такія феі, прычым даволі незвычайныя. Справа ў тым, што казачныя феі дзеляцца на добрых і злых: добрыя заўсёды дапамагаюць людзям, якія трапілі ў бяду; злыя ж, наадварот, усяляк спрабуюць ім нашкодзіць і нават, калі атрымаецца, зусім загубіць.

Феі казачнага лесу, пра якія ідзе гаворка, не былі ні добрымі, ні злымі. Дакладней, яны маглі быць, як добрымі, так і злымі, і гэтыя два станы ў лясных фей строга чаргаваліся. І калі сёння такая фея была вельмі добрай і чулай, то ўжо на наступную раніцу яна прачыналася злой і нават бязлітаснай. А потым зноўку станавілася добрай... і зноўку злой... Што самае дзіўнае, самі феі не бачылі ў гэтых іх пастаянных ператварэннях нічога асаблівага. Проста са спакон веку было заведзена ў гэтым казачным лесе.

Але была сярод гэтых фей адна, якая ў кожны з «добрых» сваіх дзён вельмі пакутавала праз неабходнасць ужо на наступную раніцу зноўку станавіцца злой і бязлітаснай. О, як жа хацелася ёй назаўсёды застацца добрай, як жа яна ў наіўных сваіх летуценнях марыла аб тым, што так і адбудзецца аднойчы... Але нічога такога, на жаль, ніколі не адбывалася. А прачнуўшыся раніцай, Фея і сама са смехам успамінала ўчарашнія свае летуценні і нават злосна насміхалася з іх, і з сябе ўчарашняй. І такое паўтаралася раз за разам, і канца гэтаму нават не прадбачылася...

І вось у адзін са сваіх «злых» дзён гэтая Фея, пралятаючы над самымі верхавінкамі дрэў, раптам заўважыла на невялікай ляснай палянцы штосьці не зусім звычайнае. Зацікавіўшыся гэтым, Фея спачатку запаволіла імклівы свой палёт, а потым, зрабіўшы над палянкай шырокае паўкола, апусцілася крыху ніжэй...

І што ж яна там убачыла?!

На палянцы пад велічэзным векавым дубам ляжаў нейкі мужчына ў шыкоўным адзенні з парчы і шоўку. Праўда, цяпер адзенне мужчыны было ў многіх месцах разадранае, ды яшчэ і ў шматлікіх крывавых плямах.

Непадалёку стаяў, нізка апусціўшы галаву, статны вараны жарабец, таксама ў вельмі дарагой збруі. А побач з ім, над высокай густой травой, грозна ўзвышалася калматая туша велізэзнага дзіка-адзінца, які, як ведала Фея, жыў менавіта ў гэтых месцах і ўжо загубіў нямала паляўнічых, спачатку завабліваючы іх у самы лясны гушчар, а потым нападаючы знянацку. У тоўстай шыі дзіка тырчэў абломак дзіды, побач ляжаў скрываўлены меч.

— Ха-ха-ха! — злосна зарагатала Фея, завісаючы нерухома ў паветры. — Вось і яшчэ адзін ганарлівы чалавечак надумаўся мерацца сіламі з нашым слаўным дзікам! Шкада толькі, што ён схітрыўся ўсё ж нейкім неверагодным чынам адолець звера, і небарака-дзік не зможа нікога з людзей больш загубіць! А яшчэ больш шкада, што чалавечак гэты і сам ужо сканаў, а значыць, я не змагу атрымаць ні з чым не параўнальную асалоду, назіраючы за доўгай і пакутлівай агоніяй гэтага нікчэмнага ганарліўца! Хоць, з іншага боку...

Фея падляцела бліжэй і ўбачыла, што пад дубам ляжыць не сталы мужчына, а зусім малады яшчэ чалавек, нават юнак... І юнак гэты ўсё яшчэ падае нейкія, хоць і вельмі слабыя, прыкметы жыцця. Потым Фея ўзняла галаву і з трывогай паглядзела на сонца, якое амаль напалову паспела ўжо схавацца сярод густых вершалін дрэў.

— Шкада... — у задуменні прагаварыла Фея і, уздыхнуўшы, дадала: — Як жа шкада, што надыходзіць вечар і мне трэба тэрмінова вяртацца дадому, так і не прычыніўшы гэтаму гора-паляўнічаму анiякай дадатковай шкоды! Але раны ягоныя, здаецца, і так смяротныя, а значыць, чалавек гэты сканае яшчэ да таго, як сонечныя промні пазалоцяць вершаліны дрэў заўтра раніцай. І мая дурненькая другая палова, хоць і пажадае нейкім чынам дапамагчы недарэку, абавязкова спозніцца з гэтым сваім ганебным жаданнем!

І Фея таропка паляцела прэч, прыкладаючы ўсе намаганні, каб паспець у сваё жытло яшчэ да таго моманту, як сонца канчаткова схаваецца за гарызонтам. Па строгіх законах нашай казкі аніводнай феі нельга было знаходзіцца за межамі свайго жытла пасля надыходу цемры, бо тады з ёй павінна было здарыцца штосьці вельмі і вельмі жудаснае. Што менавіта павінна было здарыцца, гэтага не ведаў ніхто з фей, але ўсе яны надта баяліся начной цемры. Да такой ступені баяліся, што кідаліся ў ложкі, захутваліся ў коўдры і спрабавалі заснуць яшчэ задоўга да яе поўнага надыходу.

А раніцай, прачнуўшыся ўжо добрай, Фея ўспомніла раптам пра тое, што на адной з лясных палянак знаходзіцца паранены юнак, з перадсмяротных пакут якога яна ўчора так злосна пацяшалася.

«А раптам ён яшчэ жывы?!» — падумала Фея, таропка пакідаючы сваё жытло. — Раптам я яшчэ хоць чымсьці змагу яму дапамагчы?!»

ТРЭБА адзначыць, што ўсе гэтыя феі выдатна разбіраліся ў лекавых уласцівасцях кожнай з лясных раслін: як тых, што вылечваюць усе без выключэння хваробы, так і смяротна небяспечных для чалавека. Проста ў розныя дні феі па-рознаму маглі выкарыстоўваць гэтыя свае веды: як на карысць, так і на шкоду людзям...

Але цяпер, спяшаючыся на лясную палянку, на якой пад векавым дубам ляжаў паранены юнак, Фея шукала толькі тыя расліны, з дапамогай якіх можна было загаіць самыя цяжкія, нават смяротныя раны...

— Толькі б ён яшчэ не памёр! — шаптала пры гэтым Фея. — Толькі б мне паспець!

І яна паспела, і з вялікай радасцю змагла пераканацца ў тым, што юнак усё яшчэ жывы, хоць і вельмі аслаб за папярэднюю ноч. І Фея адразу ж прынялася за лячэнне, а паколькі зёлкі, якія яна паспела сабраць за час свайго імклівага палёту, і на самой справе валодалі выключнымі гаючымі ўласцівасцямі, дзесьці бліжэй да вечара яе намаганні нарэшце пачалі прыносіць свой плён. Страшэнныя рваныя раны на целе юнака зніклі без следу; ледзь прыкметнае, перарывістае дыханне ягонае зноўку стала роўным і глыбокім; белы, нібыта абцярушаны мелам твар юнака прыкметна паружавеў...

А крыху пазней хлопец расплюшчыў вочы, крыху прыўзняў галаву і з непаразуменнем агледзеўся вакол.

— Дзе я?! — ускрыкнуў ён, ускокваючы на ногі. — Што са мной адбылося?

Тут ён убачыў каня, які, ускінуўшы галаву, радасна заіржаў.

— Ах ты мой Варанок! — ласкава прашаптаў юнак, падыходзячы да жарабца і пяшчотна праводзячы далонню па ягонай гладкай шыі. — Ты не кінуў мяне, як усе астатнія! А вось і дзік, якога я паспеў усё ж забіць перад тым, як канчаткова страціць прытомнасць...

Тут юнак зноўку і пачаў уважліва аглядаць сваё разадранае, скрываўленае адзенне.

— Кроў... — здзіўлена шаптаў ён пры гэтым. — І тут кроў! Столькі крыві, а на целе аніводнай драпіны! Але ж гэта немагчыма, так не павінна быць, бо я ж памятаю, як жудасныя іклы гэтай ляснай пачвары літаральна раздзіралі маё цела, як лілася кроў са шматлікіх ран...

Тут юнак азірнуўся і ўбачыў нарэшце Фею, што стаяла непадалёку і ўсё яшчэ трымала ў далонях непатрэбныя ўжо травы-зёлкі. Яна разумела, што лішняя тут, што ёй трэба знікаць, і знікаць неадкладна... Але чамусьці не магла нават з месца скрануцца і ўсё працягвала стаяць нерухома і глядзець на прыгожага юнака.

І юнак таксама глядзеў на яе нейкі час моўчкі, а потым падышоў амаль ушчыльную.

— Гэта ты выратавала мяне, мілая дзяўчына? — спытаўся ён і адразу ж, не чакаючы нават адказу, дадаў: — Калі б ты толькі ведала, якая ты прыгожая!

Фея і на самой справе была вельмі прыгожая, але да гэтага моманту яна аб тым не тое каб не ведала, проста не задумвалася. І вось цяпер нечаканая адчула, як аглушальна затрымцела, застукала сэрца ў грудзях, як нейкая дзіўная салодкая стома ахапіла раптам усю яе без астатку.

— Паўтары гэта яшчэ раз! — прашаптала Фея ціха, ледзь чутна. — І скажы мне, хто ты такі?..

— Ты вельмі прыгожая, мілая дзяўчына! — паслухмяна паўтарыў юнак. — Ты наогул куды прыгажэйшая за ўсіх тых прыгажунь, якіх мне пашчасціла бачыць хоць калі! Што ж тычыцца мяне, то я каралевіч, сын уладара ўсёй гэтай краіны, а значыцца, і вашага лесу таксама. І яшчэ я вельмі хачу, каб ты згадзілася стаць маёй жонкай!

Ён змоўк у чаканні адказу, але Фея так нічога яму і не адказала.

— Калі ты з нейкай прычыны не жадаеш пакідаць свой лес і ехаць са мной у каралеўскі палац, то я згодны назаўсёды застацца з табой тут, у лесе! — з гарачнасцю ўсклікнуў юнак. — Я адракуся ад тытула каралевіча на карысць свайго малодшага брата, я адракуся ад усяго, што звязвае мяне з мінулым, толькі б заўсёды быць з табой, размаўляць, проста бачыць цябе... Бо я закахаўся ў цябе з самага першага позірку!

Тут Фея ўзняла галаву і паглядзела на сонца.

— Не гавары так! — закрычала яна з трывогай і нават са спалохам. — Бо гэта... гэта проста немагчыма! Лепш сядай на свайго каня і скачы прэч адсюль! Скачы як мага хутчэй, бо калі ты зараз жа не пакінеш мяне, то ўжо заўтра раніцай з табой можа здарыцца вялікая бяда! І яна абавязкова здарыцца, і я ніколі потым не дарую сабе гэтага... — прашаптала Фея напрыканцы і заплакала.

— Самая вялікая бяда можа здарыцца са мной толькі ў тым выпадку, калі я пакіну цябе цяпер і ніколі ўжо больш не ўбачу! — прашаптаў у адказ каралевіч. — Бо я не змагу жыць без цябе, так моцна я цябе кахаю!

І ён, падышоўшы да Феі ўшчыльную, пяшчотна яе абняў. А Фея, зірнуўшы яшчэ раз у бок сонца, адчула раптам, што ёй вельмі не хочацца вяртацца дадому, каб звычна схавацца там пад коўдрай ад бязлітаснай начной цемры. Дык ці не лепей будзе, калі цемра гэтая загубіць яе яшчэ да таго, як яна зноўку пачне ператварацца ў хціўую і бязлітасную фурыю?!

— Пацалуй мяне! — прашаптала Фея, праводзячы тужлівым поглядам залацісты сонечны дыск, што знікаў паміж дрэў. — Мяне ніхто ніколі яшчэ не цалаваў...

А потым сонца зайшло канчаткова, у лесе запанавала поўная цемра. А з Феяй нічога благога так і не здарылася. Яна ўсё яшчэ была жывой і, што яшчэ больш дзіўна, па-ранейшаму заставалася добрай. І нават калі зноўку надышла раніца і сонца напоўніла свaімі пяшчотнымі промнямі маленькую лясную палянку, нічога не змянілася...

«Няўжо гэта цяпер назаўсёды? — узрадавана падумала Фея. — Няўжо збылася ўсё ж мая самая запаветная мара? І як добра, што цемра гэтая застала мяне сёння, а не ўчора! Цікава, а тады б так і засталася злой назаўсёды?»

Але пра падобны варыянт развіцця падзей Феі не хацелася нават думаць.

■ Экслібрыс «Звязды»

# ДЗЁРЗКАСЦЬ ЦІ МУДРАСЦЬ?

Алена Стэльмах. Дуб і крумкач. — Мінск: Звязда, 2016. — 24 с.




**Калі меркаваць па колькасці старонак у гэтым выданні, то можа падацца, што перад намі — кніга для дзяцей. Але гэта цалкам памылковае сцверджанне. Грунтоўнасць твора не залежыць ад яго аб'ёму. Таму зусім не дзіўна, што ў выданні такой маленькай формы чытач пазнаёміцца з надзвычай глыбокай філасофскай казкай.**

Памятаеце «Казкі жыцця» Якуба Коласа, у якіх класік у вобразах дрэў, раслін, жывёл зашыфраваў адвечныя законы чалавечага існавання, расказаў гісторыі з ледзь не біблейскай глыбінёй і шматсэнсоўнасцю? Кожная з тых казак — зразумелая хутчэй даросламу, чым дзіцяці, — у маленечкім аб'ёме змяшчала расповед даўжынёй у вечнасць, сімвалы з якога можна інтэрпрэтаваць амаль бясконца. Вось і Алена Стэльмах, расказваючы гісторыю сваркі-супрацьстаяння дуба і крумкача, мае на ўвазе зусім не свет прыроды.

